PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 36 (2469) Год XLVIII | Беласток, 7 верасня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Пагадненне аб узаемных паездках

26 жніўня 2003 г. у Мінску намеснікамі міністраў замежных спраў Польшчы — Анджэем Залуцкім і Беларусі — Аляксандрам Герасіменкам было падпісана міжурадавае польска-беларускае Пагадненне аб узаемных паездках грамадзян. Гэты дакумент прадугледжвае ўвядзенне віз для грамадзян абедзвюх краін, паколькі Польшча, у адпаведнасці з патрабаваннямі Еўрапейскага Саюза, абавязана ад 1 кастрычніка г.г. увесці візавы рэжым для сваіх усходніх суседзяў.

Кошт аднаразовай візы складзе 10 еўра, а шматразовай гадавой — 50 еўра. Для атрымання візы не патрабуецца наяўнасці запрашэння. Пагадненне дазваляе бясплатна выдаваць візы дзецям да 16 гадоў, асобам старэй за 65 гадоў, членам дэлегацый, якія перасякаюць мяжу для ўдзелу ў спартыўных, культурных і навукова-тэхнічных мерапрыемствах, студэнтам, якія вучацца па міжвучэльняным абмене, інвалідам і спадарожнічаючым ім асобам, прадстаўнікам еўрарэгіёнаў „Нёман", „Буг" і „Белавежская пушча". Грамадзяне абедзвюх краін змогуць два разы ў год атрымаць на 10 дзён дармовую візу для наведвання магіл сваякоў на тэрыторыі суседняй краіны. Акрамя таго, напалову зніжаецца кошт візаў для грамадзян, якія наведваюць сваякоў.

Візы не патрабуюцца ад уладальнікаў дыпламатычных пашпартоў (з выключэннем асоб накіраваных на работу ў прадстаўніцтвы Польшчы ў Беларусі і Беларусі ў Польшчы), ад членаў экіпажаў марскіх і паветраных караблёў, у тым ліку выратавальных самалётаў, а таксама ад грамадзян абедзвюх краін, якія маюць пасведчанне на пастаяннае жыхарства. Пагадненнем прадугледжваецца таксама бязвізавы транзіт у краіны Шэнгена, Чэхію і Славакію пры наяўнасці візаў адпаведных краін.

Шматкратныя візы будуць выдавацца чыгуначнікам і шафёрам, якія ажыццяўляюць міжнародныя перавозкі, удзельнікам абмену, арганізаванага дзяржаўнымі і самаўрадавымі ўладамі.

На тэрыторыі Беларусі візы будуць выдавацца ў дыппрастаўніцтвах у Мінску, Брэсце і Гродне, а на тэрыторыі Польшчы — у Варшаве, Беластоку, Гданьску і Белай-Падляшскай.

Віцэ-міністра Анджэя Залуцкага прыняў міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў. У ходзе сустрэчы было адзначана, што пасля ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз мяжа паміж абедзвюма краінамі павінна заставацца граніцай добрасуседства, супрацоўніцтва і дружалюбных адносін.

Віталь Луба

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

У солтыса Трасцянкі Уладзіміра Васілюка цячэ ўжо вада з крана

Урэшце пацячэ з крана

— У мяне да хаты была праведзена свая вада, са студні, — кажа Мікалай Максімчук, — але калі праклалі водаправод, я не задумоўваўся, адразу падключыўся. Свая ўстаноўка часта псавалася, напрыклад, калі святло адключалі, то або помпы запіхаліся, або матор заціраўся. А цяпер я пэўны, што вада будзе ўвесь час.

З вадой Трасцянка і навакольныя вёскі мелі клопат. Паўночная частка гміны Нарва, за аднайменнай ракой, не мела водаправодаў. Апошнія леты ўсё больш сухія. Калодзежы высыхалі. Гаспадары не мелі чым паіць жывіну.

— Ратавала нас рэчка, — кажа Уладзімір Васілюк, солтыс Трасцянкі, — але з пітной вадой у некаторых былі праблемы.

Гмінная ўправа пачала змагацца з гэтымі клопатамі ў 1999 годзе. Купіла тады артэзіянскі калодзеж у Іванках. Год пазней выхадзіла грошы з Кантракту для Белавежскай пушчы на яго рамонт, устаноўку помпаў і апаратуры для паляпшэння якасці вады. Разам — семсот тысяч злотых. Вада з крана „за Нарвай" найхутчэй пацякла ў Іванках-Рагазах — найбліжэй вадакачкі. Цяпер прыходзіць чарга астатніх занядбаных у гэтым плане вёсак.

Водаправод у Трасцянцы, гэта найбольшая інвестыцыя Нарваўскай гміны ў апошні час. Зямныя працы ў гэтай вёсцы вяліся ўсё лета. Справу ўскладняла густая забудова, вузкая вуліца, якая ў дадатак з'яўляецца ваяводскай дарогай, ходнікі і ліпы паабапал вуліцы. Але найцяжэй было пераканаць старэйшых, што вада ў хаце патрэбная, што гэта вялікая палёгка ў жыцці.

— Мае бацькі зразу не захацелі падключацца да водаправода, — гаворыць Анатоль Ясюк, у якога на панадворку працуе землечарпалка, — але я іх намовіў, заехаў у гміну, заплаціў паўтары тысячы і ўсё-ткі будзем мець ваду. Падключаюць нам яе ў другім туры.

На жаль, бацькі Анатоля Ясюка гэтага не дачакалі. Сам ён жыве ў Беластоку, але не зракаецца бацькоўскай хаты. Нават, калі будзе яна служыць як дача, ванная ў ёй патрэбная. Гэта тыповая сітуацыя ў Трасцянцы, жыхары якой ў 60-70-я масава хлынулі ў Беласток. Менавіта гарадскія дзеці (хоць таксама часта ўжо сівыя) паўплывалі на сваіх старых бацькоў, каб яны даводзілі ваду да сваіх гаспадарак.

— Калі мы рыхтавалі планы, на ваду запісаліся дзевяноста гаспадароў, — расказвае Якуб Садоўскі, войт Нарваўскай гміны. — Мы тады звярнуліся з просьбай аб дапамогу да еўрасаюзнай праграмы SAPARD і атрымалі яе. Пракладка водаправода і падключэнне да яго дзевяноста падворкаў каштавала 531 тысячу злотых, з якіх SAPARD вяртае нам 251 тысячу.

Калі ў Трасцянцы пацякла вада з кранаў, схамянулія і тыя, хто раней лічыў гэта непатрэбнай і задарагой раскошай. Яшчэ сорак асоб заявілі ахвоту падключыцца да водаправода. Хаця на гэта гміна не атрымае датацыі з Еўрасаюза, але просьба будзе задаволена.

Цяпер у Трасцянцы вядуцца завяршальныя працы. Работнікі падключаюць да водаправода апошніх жадаючых.

У чарзе чакаюць наступныя вёскі Нарваўскай гміны, з паўночнай яе часткі. І так сорамна, што дачакаліся яны XXI стагоддзя без вады.

Мікола Ваўранюк

На Макавея на Палессі ☞ 3

На Макавея, у многіх раёнах Беларусі, ля калодзежаў служыцца малебен. Людзі перакананы, што ў гэты дзень вада мае гаючыя якасці. Ля крыніцы хворыя прамываюць вочы і раны. У мінулым асвечаныя ў гэты дзень мак і ваду выкарыстоўвалі для выклікання дажджу.

Беларусам савецкія школы ☞ 4

Ліквідацыю беларускага школьніцтва на Беларусі немагчыма тлумачыць толькі імкненнем улад да інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй. Да Расіі маглі б яны далучацца як Беларусь і беларусы, са сваёй культурай, мовай і гісторыяй. Інтэграваецца так як гэта адбываецца ва ўсёй Еўропе. Але яны ніколі не былі беларусамі, а толькі саветамі.

Дабравесце ад Міколы Раманавіча ☞ 5

На магілцы Міколы Гайдука ўзведзены прыгожы помнік. Больш каштоўны пакінуў ён у беларускай літаратуры і журналістыцы. Пасля яго засталіся кнігі — свае і чужыя, архіўныя фотаздымкі, мноства машынапісаў, дакладна, акуратна раскладзеных па папках, нотныя запісы песень... Жонка Міколы Гайдука Лідзія ў 1999 г. перадала ў Беларускі музей у Гайнаўцы ўсю ягоную спадчыну.

Кляшчэлеўскія святкаванні ☞ 8

У 13 гадзін на спартыўнай пляцоўцы пачалося спаборніцтва пажарных каманд за кубак бурмістра горада. Удзельнічала ў ім чатыры каманды дабравольцаў і дзве маладзёжныя: хлопцаў і дзяўчатак. Пераможцамі аказаліся гаспадары. Чарговыя месцы занялі пажарнікі з Дашоў і Палічнай. Усе яны атрымалі пераходныя кубкі бурмістра.

Трымайцеся праваслаўнай традыцыі ☞ 9

Архіепіскап Афінаў і ўсёй Грэцыі Хрыстадул маліўся ў варшаўскіх цэрквах св. Марыі Магдаліны і св. Іаана Лесвічніка, спаткаўся з прадстаўнікамі польскага ўрада. На Святой Гары Грабарцы ўдзельнічаў у святкаваннях Праабражэння Гасподняга. Пасля сустрэўся з беластоцкімі вернікамі.

Да коней трэба мець падыход ☞ 11

Магдаліна Мішчук, вучаніца прафесійнай школы ў Гайнаўцы, таксама ездзіць на кані ад васьмі гадоў. Азаў верхавой язды вучылася ў „Сапліцы" каля Варшавы, пасля практыкавалася ў іншых манежах, гайнаўскіх.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Уладзімір Арлоў не ўпісаўся ў ідэалогію

Фота IREX/Promedia

Дырэктарка рэдакцыйна-выдавецкай установы „Літаратура і мастацтва" Таіса Бондар загадала прыбраць з апошняга нумара штотыднёвіка „Літаратура і мастацтва" артыкул, прысвечаны 50-м угодкам Уладзіміра Арлова. Імя пісьменніка было выкрэсленае і з кнігі „Мы — беларусы", якая рыхтуецца да друку.

Нумар газеты „Літаратура і мастацтва", падрыхтаваны пры дзейным удзеле адміністрацыі прэзідэнта, з большага прысвечаны пытанням ідэалагічнай працы. У гэты ж нумар літаратурны крытык Ала Сямёнава на замову рэдакцыі падрыхтавала вялікі артыкул да юбілею Уладзіміра Арлова. Планавалася гэтаксама надрукаваць фотаздымкі пісьменніка разам з Васілём Быкавым і Рыгорам Барадуліным. Адметна, што артыкул быў прысвечаны выключна літаратурнай дзейнасці вядомага пісьменніка, і ў ім ніяк не згадваліся ягоныя палітычныя погляды.

Дырэктарка рэдакцыйна-выдавецкай установы „Літаратура і мастацтва" Таіса Бондар не пажадала каментаваць гэтую сітуацыю. Дарэчы, напярэдадні Таіса Бондар насіла ў адміністрацыю прэзідэнта на ўзгадненне гранкі кнігі „Мы — беларусы", якую выдае літаратурны холдынг. У адміністрацыі загадалі выкрэсліць з кнігі імя Уладзіміра Арлова.

Супрацоўнікі газеты „Літаратура і мастацтва" звязваюць гэтыя падзеі з узмацненнем гэтак званай ідэалагічнай працы ў літаратурнай сферы. Тым больш, што яшчэ некалькі месяцаў таму выдадзеная нядаўна энцыклапедыя Уладзіміра Арлова „Краіна Беларусь" актыўна рэкламавалася на дзяржаўным тэлебачанні.

Хартыя '97, 29.08.2003 г.

Саюз палякаў папярэдзілі

Міністэрства юстыцыі праінфармавала Саюз палякаў Беларусі аб тым, што ў іх дастаткова падставаў для ўзняцця пытання аб ліквідацыі арганізацыі ў судовым парадку. СПБ зараз з'яўляецца найбуйнейшай у краіне грамадскай арганізацыяй. Пісьмовае папярэджанне падпісаў намеснік міністра юстыцыі Петраш.

У пісьмовым папярэджанні, дасланым на імя старшыні Саюза палякаў Беларусі спадара Кручкоўскага, інкрымінуецца, што пры ажыццяўленні справаводства арганізацыі шэраг дакументаў афармлены на польскай мове. У тым ліку пячатка арганізацыі, афіцыйныя бланкі. Зазначана, што ў Саюзе палякаў дзейнічаюць незарэгістраваныя структуры. Так у Гродне дзейнічае Таварыства польскай моладзі пры грамадскім аб'яднанні, а, маўляў, павінна быць асобна пастаўлена на ўлік. Ашмянскі раённы аддзел таксама парушае статут і выкарыстоўвае пячатку, напісаную па-польску. З улікам гэтых і іншых парушэнняў Міністэрства юстыцыі выносіць Галоўнаму савету СПБ пісьмовае папярэджанне.

У Саюзе палякаў здзівіліся падобнай паперы. Намеснік старшыні СПБ Юзэф Пажэцкі кажа, што такім чынам дакументацыю яны афармляюць ужо 15 гадоў, і не было ніякіх заўвагаў. Больш таго, усё гэта адпавядае статуту арганізацыі, які зарэгістраваны ў Міністэрстве юстыцыі. Ён звязвае папярэджанне з агульным наступам уладаў на грамадскія арганізацыі Беларусі. Ю. Пажэцкі заявіў, што кіраўніцтва СПБ ужо звярнулася за дапамогай у дыпламатычныя прадстаўніцтвы Рэспублікі Польшча ў Беларусі. Больш таго, яны гатовыя абараняць свае правы ў судзе і нават звярнуцца за дапамогай да міжнароднай супольнасці, паколькі лічаць, што такім чынам у Беларусі парушаюцца правы нацыянальных меншасцей.

М. Мікалайчык

„Биржа информации", № 290 ад 28.08.2003 г.

Пошукі бандытаў

Польская паліцыя працягвае пошукі бандытаў, якія напалі на чатырох беларускіх грамадзян уначы 15 жніўня. Жорсткі разбойны напад на дарозе ў гміне Жэч Заходнє-Паморскага ваяводства ўчынілі ўзброеныя бандыты ў цёмнай уніформе і масках, якія адабралі ў беларусаў 4 тысячы долараў і жорстка збілі вадзіцеля, які аказаў актыўнае супраціўленне. Паводле інфармацыі павятовай паліцыі ў Хошчне, тыя, хто нападаў, перагаворваліся на рускай мове, аднаго з іх называлі па імені Максім.

Стан вадзіцеля польскія медыкі характарызуюць як вельмі цяжкі. Трое астатніх беларусаў, якія пацярпелі менш, ужо вярнуліся на радзіму.

БЕЛТА, 25.08.2003 г.

Замест адпачынку — змаганне

Надыход новага навучальнага года вучні і студэнты, выкладчыкі і настаўнікі заўсёды сустракаюць з ухмылкамі на тварах. Тут не толькі радасць спаткання са сваёй навучальнай установай, якую многія завуць другім домам, і са сваімі сябрамі і калегамі, па якіх паспелі засумаваць, але і добрыя ўспаміны, якімі быў перапоўнены летні адпачынак.

На жаль, не для ўсіх дзяцей у Беларусі гэтае лета застанецца ў памяці як час бестурботнай асалоды колерамі лета, прыемных вандровак і насычанай прагі проста адпачыць. Часам змагання за права вучыцца і вучыць па-беларуску сталі тры апошнія месяцы для навучэнцаў, іх бацькоў і выкладчыкаў Беларускага нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Я. Коласа.

У 24-м нумары „Нівы" ад 15 чэрвеня гэтага года мы распавядалі аб прызначэнні ў адзіную ў беларускай сталіцы беларускамоўную сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову дырэктаркі, якая не валодае беларускай мовай і які шквал пратэсту выклікала гэтая падзея ў вучнёўскім і выкладчыцкім калектыве. Прыкра, але цягам лета сітуацыя засталася не толькі не вырашанай, але пагоршылася і ўскладнілася для абодвух бакоў канфлікту — ліцэйскай „грамады" і Міністэрства адукацыі.

Паведамленні, што тычацца падзей вакол навучальнай установы нагадваюць вайсковыя весткі, з той толькі папраўкай, што вайна гэтая — псіхалагічная. У будынку ліцэя, які быў перададзены ў мінскую камунальную маёмасць, гарадское ўпраўленне адукацыі распачало рамонт. Менавіта гэтым чыноўнікі абгрунтавалі немагчымасць правядзення там заняткаў. Аднак Дэпартамент па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры запатрабаваў спынення ўсялякіх рамонтных работ, бо яны праводзяцца без дазволу Дэпартамента, што ёсць парушэннем закону. Але для змагароў з беларушчынай законаў не існуе — з дапамогай міліцыі і спецпадраздзяленняў яны не дапускаюць у будынак ліцэя ані выкладчыкаў, ані навучэнцаў. І рамонт працягваецца.

Дзіўная сітуацыя паўстала перад ліцэем як перад установай. З аднаго боку Нацыянальны дзяржаўны гуманітарны ліцэй ліквідуецца, а абяцаны гарадскі ліцэй яшчэ не створаны. У выніку дакладна ніхто не ведае куды пойдуць вучыцца дзеці 1 верасня. Чыноўнікі ад адукацыі спрабуюць размеркаваць падлеткаў па розных школах Мінска, не зважаючы на жаданне бацькоў, праграмы і мову навучання. Дзе будуць працаваць выкладчыкі таксама невядома — па законе яны ўсе разам з новапрызначанай „беларусанямой" дырэктаркай звольненыя з прычыны ліквідацыі ліцэя.

У сваю чаргу абараніць свае права вучыцца на роднай мове і выкладаць на ёй спрабуюць абараніць ліцэісты, іх бацькі і выкладчыкі. Безліч пікетаў з патрабаваннямі вярнуць ліцэй, збор подпісаў у яго абарону, правядзенне „жывых калідораў" перад уваходам у Мінскае гарадское ўпраўленне адукацыі, праз які мусяць хадзіць чыноўнікі, прыцягваюць увагу грамадскасці да беспрэцэдэнтнай сітуацыі. З бацькоў і выкладчыкаў створаны Камітэт абароны ліцэя, які не толькі, што называецца, б'е ва ўсе званы, дасылаючы лісты і звароты ў розныя інстанцыі і арганізацыі, але і спрабуе самастойна арганізаваць навучальны працэс. Вырашаюцца пытанні месца і спосабаў навучання, прызнання яго вынікаў вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, у першую чаргу, замежнымі. Актывісты маладзёжнай ініцыятывы „Ліцэйская грамада" ладзяць разнастайныя імпрэзы кшталту раздачы ў людных месцах дзецям паветраных шарыкаў і малявання на асфальце. Бацькі нясуць заявы да ранейшага кіраўніцтва з просьбай вучыць іх дзяцей. Натхнёныя ідэяй абароны ліцэя, якога фармальна ўжо няма, дзеці і дарослыя трымаюцца разам. А гэта галоўная перадумова іх перамогі. Якая, калі будзе дасягнута, стане агульнабеларускай.

Уладзімір Лапцэвіч

Больш — на стар. 4

У Орлі выбралі войта

Жыхары Арлянскай гміны вырашылі, хто стане іх войтам на бліжэйшыя тры гады. Прыгадаем, што пасля заўчаснай смерці Яна Добаша ад 7 чэрвеня г.г. гэтая пасада заставалася вакантнай. Нечарговыя выбары праходзілі ў двух турах — 10 і 24 жніўня г.г.

За пасаду войта змагаліся чатыры кандыдаты: Міхал Іванчук — колішні войт (у першым туры набраў 611 галасоў), Міхал Гурскі — прадпрымальнік з Бельска-Падляшскага (347), Пётр Кадлубоўскі з Градалёў, кандыдат СЛД (167) і Пётр Сельвясюк з Дыдулёў — працаўнік Бельскага старостваа па справах Еўрапейскага Саюза, кандыдат Выбарчага камітэта „Кааліцыя для Орлі" (763).

У другі тур выйшлі Міхал Іванчук і Пётр Сельвясюк. Пры яўцы 71,91% выбаршчыкаў (яўка ў першым туры склала 59,75%) чацвёрты раз войтам стаў Міхал Іванчук — кандыдат Выбарчага камітэта „Арлянская зямля". Набраў ён 1187 галасоў (52,13%)

Міхал Мінцэвіч

***Паўліне Шафран** і **Міраславу Асташэвічу** на новай жыццёвай дарозе гэтак шчыра жадаем:*

Паўліне і Міраславу, каб зажылі на славу, багата, шчасліва, здарова, імкліва... Хай ім шчасціць у дзетках на родных палетках!

„Ніўцы"

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ля царквы св. Мікалая ў Кобрыне

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Цёткі Ніна і Марыя хваляць ваду ад Макавея

На Макавея на Палессі

На Макавея крыніцы маюць гаючую моц, лякуюць вочы, цела, вылечваюць жывіну. Вада з культавай крыніцы можа аздаравіць свет. У гэты дзень, за дапамогай рытуальных практык, можна выклікаць дождж.

У Заходнім Палессі, краіне пазначанай цэрквамі Міколы Цудатворца, прыведзеныя павер'і — жывыя.

* * *

У Новых Сяхновічах таксама Мікольская царква. На табліцы пазначаны час пабудовы — 1727 год. У сярэдзіне уніяцкі іканастас і старыя іконы. Тут, упершыню ва уніяцкім абрадзе, хрысцілі Андрэя Касцюшку (дзеля будучыні хрысцілі яшчэ ў касцёле, у гэты раз малому прыдалі імя Тадэвуш).

— Няма ў нас сродкаў на новы іканастас, — наракае айцец Аляксей. Уніяцкая спадчына не зусім падабаецца бацюшку, выпускніку Маскоўскай духоўнай семінарыі.

Другая царква ў парафіі, у Маціевічах, таксама памятае часы уніі. Свята-Іванаўская царква пабудавана ў 1718 годзе. На багаслужбу, раніцай, з'явілася чатырох вернікаў-старажылаў. Трох з іх — інваліды без ног. У руках бабуль вянкі з каляровых астраў.

У Здзітаве сярэдзінай вуліцы ідзе цётка з букетам спелых макавак.

— Ці, можа, царкву будзеце нам адбудаваць? — пытае.

У Здзітаве царкоўка з 1502 года. Блакітны храм узведзены на высокім беразе Мухаўца. Пакланіцца святым мучанікам прыйшло за дзеясць асоб, у большасці бабуль.

У Жабінкаўскім раёне, адкуль узяты прыклады, паўсюдна адчуваўся будзень.

* * *

Затое ў Кобрыне, у саборы Аляксандра Неўскага сабралася процьма народу. Пасля хрэснага ходу вернікі маліліся над пасудзінай з вадой, упрыгожанай кветкамі. Затым, усе стаўпіліся вакол святой вады і напаўнялі ёй бутэлькі і слоікі.

Метраў дваццаць далей рабочыя аднаўлялі будынак сабора: клалі штукатурку, размалёўвалі сцены. Ніхто не здзіўляўся і не абураўся іх рабоце, хаця зверху білі ўрачыста званы.

— То ж працоўны дзень! — пацісталі плячыма рабочыя.

Каля царквы святога Мікалая таксама бралі асвечаную ваду. Калодзеж абудаваны тут блакітнай капліцай.

— Вада ад Макавея на ўсё пануе, — кажа цётка Ніна. Заводзім гутарку пра надвор'е.

— То і ў вас такая засуха? — здзіўляецца жанчына. — А я думала, што нас одных так покарало!

Нашай размове прыслухоўваецца цётка Марыя.

— Бач, то і ў Пуольшчы е праваслаўны! — ад радасці цётка шырока ўсміхаецца і захвальвае ваду з крыніцы.

— Наша вадзіца на ўсё пануе! — Марыя падае мне кубак са свянцонай вадой.

* * *

На Макавея, у многіх раёнах Беларусі, ля калодзежаў служыцца малебен. Людзі перакананы, што ў гэты дзень вада мае гаючыя якасці. Ля крыніцы хворыя прамываюць вочы і раны.

У мінулым асвечаныя ў гэты дзень мак і ваду выкарыстоўвалі для выклікання дажджу. Яшчэ нядаўна ў многіх вёсках „сеялі" ў калодзежах мак. Напрыклад, у вёсцы Паўлаўка Хоцімскага раёна мак сеялі ў тры калодзежы. У вёсцы Стадолічы Лельчыцкага раёна ў калодзеж сыпалі асвечаны мак, вешалі на ім ручнік, боўталі калкамі ваду і галасілі спецыяльныя для гэтага рытуалу песні. Распаўсюджаны быў абрад, калі ў калодзеж вылівалі ваду, якая засталася ад работ у полі, або спецыяльна для гэтага пакінутую. Часам самі абліваліся каля калодзежа. На ўсходнім Палессі існаваў звычай кідаць у калодзеж разбіты гаршчок, каб выклікаць дождж. Гаршчок трэба было ўкрасці суседзям — ва ўдавы, гаршчэчніка або інародца. Вядомы і звычай выліваня баршчу ў калодзеж. Густы боршч сімвалізаваў густы доджджж.

Гэты старажытны абрад, як сведчаць навуковыя крыніцы, выконвалі ў час засух яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя. У вёсцы Крамянец на Лагойшчыне, ля крыніцы знаходзіўся Даждзьбогавы камень. Абрад выклікання дажджу выконвалі дзевяць удоў. Яны бралі калкі ў рост чалавека і з іх дапамогай прыўздымалі валун. Калкі стаялі пад каменем да тых часоў, пакуль патрэбен быў дождж. Удовы лічыліся богавымі сіротамі, асобамі пакрыўджанымі лёсам. Верылася, што мелі яны здольнасць адкрываць „божую браму". Лічба 9 таксама сакральная — абазначае закончанасць, усеахопнасць.

Напісаць пра старажытны абрад выклікання дажджу падштурхнулі мяне не толькі падгледжаныя на Палессі рэлікты мінулага: асвячэнне крыніц і маку, упрыгожванне калодзежаў, вера ў гаючую моц крыніц. Заходняе Палессе — краіна Міколы Цудатворца. Самым цудоўным момантам падарожжа паказаліся царкоўкі з выявай гэтага святога. Іконы св. Міколы, ацалелыя ад бальшавіцкага варварства, у многіх месцах пачалі міраточыць. Побач Парасквевы Пятніцы гэты святы ўспрымаецца як апякун крыніц і ўраджаю.

Не без уплыву асталося паўсюднае нараканне на вялікую засуху, якую ўжо другі год запар спазнала Беларусь.

Ганна Кандрацюк

Крыніцы: Э. М. Зайкоўскі, Л. У. Дучыц, *Жыватворныя крыніцы Беларусі*, Мінск, „Ураджай", 2001.

Агратурызм па-беларуску

„Сельскі турызм: выратаванне для вёскі і альтэрнатыўны спосаб адпачынку для гараджан" — гэтае пытанне было нядаўна тэмай пасяджэння Мінскага сталічнага прэс-клуба. Агратурызм, паводле ўдзельнікаў сустрэчы, можа прынесці даход для вёскі, добры адпачынак для гараджан, стварыць новыя месцы працы і павялічыць прыток падаткавых паступленняў.

Беларусь — рай для „зялёных турыстаў". Паводле даных Міністэрства народных рэсурсаў і аховы акружаючага асяроддзя, у Беларусі налічваецца каля 10 тысяч азёраў, больш за 9 тысяч балот, звыш 20 тысяч рэк і ручаёў. Агульная плошча спецыяльна ахоўваемых тэрыторый перавышае 1,4 млн. гектараў. Асаблівую гордасць краіны саставляюць Бярэзінскі біясферны запаведнік, чатыры нацыянальныя паркі — „Белавежская пушча", „Браслаўскія азёры", „Нарачанскі" і „Прыпяцкі", больш за 500 запаведнікаў. У Беларусі 575 помнікаў прыроды, а сярод іх старажытныя паркі, лясы з рэдкімі рэліктовымі відамі раслін і вялікая колькасць рэдкіх птушак.

Начальнік аддзела запаведнікаў Мінпрыроды Андрэй Голдненкаў падтрымоўвае экалагічны турызм, паколькі прыносіць ён несумненную карысць акружаючаму асяроддзю — прыродныя комплексы не разглядаюцца тады як крыніца атрымання драўніны, інакш кажучы, на дрэвах можна зарабіць, не высякаючы іх.

Да гэтай пары Беларусь была белай плямай на карце еўрапейскага экатурызму, лічыць Валерыя Кліцунова — старшыня праўлення грамадскага аб'яднання „Агра- і экатурызм", якое было зарэгістравана ў лістападзе 2002 г. Цяпер у саставе арганізацыі ўваходзіць каля 200 чалавек, галоўным чынам жыхары сельскіх мясцовасцей, якія хочуць асвоіць новую прафесію і арганізаваць на сваіх гаспадарках гасцінічнае абслугоўванне і разнародныя пазнавальныя праграмы для сваіх гасцей. Да гэтай пары арганізацыя правяла канферэнцыю „Сельскі турызм у Беларусі" і шэраг семінараў у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці і ў Гродзенскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях.

Пакуль што ніхто з членаў аб'яднання „Агра- і экатурызм" не прымае ў сябе турыстаў, але „першыя ластаўкі" павінны паявіцца ў бліжэйшы час. Само аб'яднанне стварае базу даных. Людзі прысылаюць свае пісьмы, анкеты з пералікам усяго, што могуць прапанаваць турыстам, фатаграфіі дамоў, прысядзібных участкаў, навакольных пейзажаў. Чароўныя дамы, дагледжаныя сады з ашаламляльнымі клумбамі, утульныя альтанкі на чыстых панадворках, драўляныя скульптуры, столікі і крэслы пад паветкамі, мангалы для шашлыкоў, міленькія лазенькі. У адной з сядзіб гаспадар з фантазіяй падышоў да вялікага сухога дрэва ў сябе на двары — уладкаваў на яго верхавіне штосьці ў выглядзе ўстойлівага буслінага гнязда, у якім паставіў стол з крэсламі. Узышоўшы па драўлянай лесвічцы на вершаліну, устойлівы госць знаходзіць падарунак ад гаспадара — бутэлечку са смачнай свойскай настойкай, якую проста на месцы можна прадэгуставаць, любуючыся з вышыні наваколлем.

Намеснік начальніка упраўлення турызму Міністэрства спорту Уладзімір Кушчыенка абяцае зрабіць усё для паскарэння заканадаўчага забеспячэння развіцця агратурызму ў Беларусі. У гэтым годзе будзе выдадзены дэкрэт датычны агратурызму і ўнесена ў парламент новая рэдакцыя закону аб турызме, у якім адзін раздзел будзе прысвечаны сельскаму турызму. Не чакаючы прыняцця закону, міністэрства намерана максімальна спрасціць гэты бізнес так, каб жыхары вёскі маглі займацца ім без усялякіх ліцэнзій. Да канца гэтага года аб'яднанне „Агра- і экатурызм" плануе выдаць ілюстраваны каталог беларускіх сядзіб, якія прапануюць свае паслугі гараджанам і замежным турыстам. У пазнейшым тэрміне выйдзе буклет „Адпачынак у беларускай вёсцы".

Паводле ПАП і „Туризма и отдыха"

Беларусам савецкія школы

Ад некалькіх месяцаў з Беларусі плывуць інфармацыі, што ўлады закрываюць адзіны ў Мінску ліцэй, у якім усё навучанне вялося на беларускай мове. Гэта славуты ўжо ліцэй імя Якуба Коласа. Выкладчыкамі працавалі ў ім мінскія інтэлектуалы, а якасць адукацыі дасягала універсітэцкага ўзроўню.

Спробы ліквідаваць ліцэй рабіліся ўжо некалькі гадоў, але бацькі і настаўнікі пратэстамі, пікетамі і іншымі метадамі стрымоўвалі дзейнасць лукашэнкаўскіх чыноўнікаў. Аднак вясной гэтага года ўлады адхілілі ад пасады стваральніка і адначасова дырэктара гэтай асветнай установы Уладзіміра Коласа, а на яго месца прызначылі нікому невядомую Тацяну Шчабрановіч. Для ўсіх у Мінску стала зразумелым дзеля якіх мэтаў прывезлі ў ліцэй гэтую даму. Бацькі, настаўнікі, вучні абараняюць свайго дырэктара, але ў Беларусі голас грамадства мае толькі сімвалічнае значэнне.

Слухаючы расказы мінскіх калег пра ліцэй адразу хочацца спытаць, толькі невядома ў каго: чаму ў незалежнай беларускай дзяржаве яе ўлады паводзяць сябе як акупанты? Чаму грамадства не пратэстуе і пагаджаецца на пераўтварэнне краіны ў зону ўплываў чужой культуры? Пражываючы на Беласточчыне лёгка знайсці адказ на другое пытанне. У нас грамадства таксама ніколі не пратэставала, калі знікалі школы з беларускай мовай навучання, але тут Польшча і польская ўлада. Там — Беларусь і свая дзяржава.

Ліквідацыі беларускага школьніцтва ў Беларусі немагчыма тлумачыць толькі імкненнем улад да інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй. Да Расіі маглі б яны далучацца як Беларусь і беларусы, са сваей культурай, мовай і гісторыяй. Інтэгравацца так як гэта адбываецца ва ўсёй Еўропе. Але яны ніколі не былі беларусамі, а толькі саветамі. Савецкае ў пераважнай большасці грамадства таксама не патрабуе паводзіць сябе інакш чым паводзіць.

У ліцэі імя Якуба Коласа вучылі патрыятычнага мышлення, пашаны для свае гісторыі і культуры. Ліцэй быў адным з цэнтраў беларускасці ў сталіцы Беларусі. У гэтай школе вучылі моладзь, што асновай сучаснай беларускай дзяржаўнасці была аб'яўленая 25 сакавіка 1918 г. па волі нацыянальнага прадстаўніцтва Беларуская Народная Рэспубліка. Ва ўрадавых савецкіх школах моладзь пераконваюць у тым, што такую ролю адыграла аб'яўленая расійскімі камуністамі ў Смаленску Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка. Нават не тлумачаць, што нарадзілася яна ў кабінеце камісара па справах нацыяналнасцей Савецкай Расіі Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Антыбеларускую палітыку праводзіў таксама вялікі будаўнік камунізму Пётр Машэраў, які астаўся ў памяці грамадзян рэспублікі як стваральнік дабрабыту. Карыстаецца ён цяпер такой папулярнасцю, як Эдвард Герэк у палякаў. Нікому не перашкаджае, што падчас яго панавання беларуская асвета і культура былі зведзены амаль да нуля. Свядомы гэтага прэзідэнт Лукашэнка таксама пэўна разлічвае на вечную ўдзячнасць сваіх савецкіх падданых. На беларусаў яму не трэба звяртаць увагу. У вачах беларускай меншасці ў Беларусі прэзідэнт і так будзе ўспрымацца як дыктатар і здраднік.

Лукашэнка аднак у сапраўднасці нікога не здрадзіў. Рэалізуе палітыку згодную з воляй большасці. Элітарны ліцэй ёсць (быў?) школай беларускай меншасці. Рыхтаваў кадры альтэрнатыўнага руху, які ў спрыяльных умовах беларускую меншасць хутка мог бы пераўтварыць у большасць. Саветы гэта ж этнічныя беларусы. Каб стаць беларускім палітычным народам, патрабуюць яны толькі адпаведных школ і сродкаў інфармацыі. Ведаюць пра гэта таксама цяперашнія ўладальнікі краіны. Змена палітычнай сітуацыі магла б абазначаць для іх сур'ёзныя клопаты. Таму сістэму інфармавання і выхавання грамадства стараюцца трымаць пад цалкавітым кантролем. Кожная беларуская газета, выданне, незалежная арганізацыя яўляецца ім як патэнцыяльны цэнтр варожых сіл. Ліцэй імя Якуба Коласа не мог быць выключэннем.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Ну, не люблю цябе я, Ваня

Калі б я быў журналісцкай гіенай, пэўна, жыў бы я багата з заўсёдных, як кажа моладзь, *задым*, выкліканых беластоцкай правіцай у адносінах да меншасцей. Іх апісванне „набівала б" мне ганарары настолькі, што я, хоць бы перад калегамі-журналістамі з іншых рэгіёнаў Польшчы кожны раз свяціў бы вачыма, прымушаны да адказвання на пастаяннае пытанне: „Ну, і што там у вас тварыцца?" Прычыну для сораму ў гэты раз (дарэчы, не першы) падалі самаўрадаўцы Гарадской беластоцкай рады, а дакладней, яе прадстаўнікі з клубаў Лігі польскіх сем'яў (LPR; вось, гэтыя дык набіваюць касу журналісцкім гіенам!), Права і Справядлівасці — PiS, і адзін з Беластоцкага паразумення правіцы (BPP). Заблакавалі яны план прасторавага добраўпарадкавання беластоцкага пасёлка Беласточка. Справа ў царкве, якая, згодна з яго прадпасылкамі, мела б там узнікнуць. Гарадскім дзеячам правіцы гэта вельмі не ў смак. Лідэр клуба LPR, а ў папярэдніх кадэнцыях па чарзе член Гарадское ўправы, пасля віцэ-прэзідэнт Беластока, аргументаваў, што пабудова царквы перашкаджае ахове ракі Белай і перашкодзіць разбудове вуліцы Тысячагоддзя польскай дзяржавы. Але, як у пагаворцы: знайдзіце мне патэнцыйнага злачынцу, дык закон заўсёды знойдзецца. Ні на што не здаліся аргументы радных лявіцы, што ахоўная паласа ракі Белай не перашкодзіла паставіць у ёй каталіцкі касцёл, які ўжо пару гадоў узвышаецца над Беласточкам і тое, што ў ваколіцы пабудовы царквы пашырэнне вуліцы Тысячагоддзя немагчымае, паколькі стаяць там бензакалонкі. Не ўспомню ўжо пра аргумент айца Рыгора Місіюка, прэс-інфарматара праваслаўнай Беластоцка-Гданьскай епархіі, што на Беласточку пражывае каля трох тысяч вернікаў, царквы няма, а найбліжэйшая знаходзіцца на Антонюку — Святадухаўская. Гэтая аргументацыя якраз, на маю думку, як вада на млын беластоцкіх радных — абаронцаў заходнехрысціянскага касцёла. У імя своеасабліва разуметага экумензіму, пэўна, для праваслаўных, а гледзячы з нацыянальнага пункту — для беларусаў, прынялі б яны такі план прасторавага добраўпарадкавання, згодна з якім у Беластоку ўзнікла б праваслаўна-беларускае гета, а яшчэ лепш усіх беларусаў, а шырэй праваслаўных, было б перасяліць з Беластока, як кажуць, спадкаемцы каталіцкай традыцыі Вільні. І то найлепш — у Беларусь.

Невядома, як завершыцца справа, я не думаю, аднак, што LPR, PiS і прадстаўнікі BPP памяняюць свой пункт гледжання. Аргументы заўсёды знойдуцца. Розных безвыніковых прапаноў, якія датычылі пабудовы царквы, было ўжо больш за дзесяць на працягу трох гадоў хадайніцтва за яе пабудову.

Прыгадалася мне пры гэтай нагодзе іншае дзеянне, у гэты раз левай Падляшскай маршалкоўскай установы, якая нядаўна распісала конкурс на дырэктара ведамства культуры. Сярод умоў, якія мусіў выпаўніць кандыдат, знайшлася і такая: трэба мець адпаведнае здароўе, каб быць на кіраўнічай пасадзе. Якія гэта ўмовы — чорт іх ведае. Калі б тая чыноўніцкая камісія ўперлася, каб абсекчы не тых што трэба кандыдатаў, то пад такім прэтэкстам магла б прычапіцца хоць бы да яшчэ „непраходжаных" свінкі ці сыпу, асабліва, што іншая з умоў гаворыць аб неабходнасці адпаведнага выгляду.

Усё гэта ў сваю чаргу нагадвае стары ўсходнеславянскі анекдот. Ваню згарэў дом, кінула яго жонка з дзецьмі, страціў ён і працу, адным словам, усё яму завалілася. У роспачы ўскінуў Ваня рукі да неба: „Божа, чаму ўсё гэта!?" А на тое Айцец з-за хмар: „Проста, не люблю цябе я, Ваня."

Так, вось, вернемся да плана добраўпарадкавання Беласточка і заблакіравання там пабудовы царквы. Цяжка не задумацца над выказваннем епіскапа Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакава, які акрэсліў усё гэтае здарэнне як праяву неталерантнасці, а нават варожасці ў адносінах да праваслаўных.

І яшчэ адно. Складваецца ўражанне, што пад лозунгам абароны плана і яго вынікаў адзін з лідэраў клуба радных СЛД — Кшыштаф Біль-Ярузельскі як кандыдат на сенатара ад Саюза ў набліжаючыхся дапаўняльных выбарах, лёгка набівае свой палітычны капітал. У абароне пабудовы царквы на Беласточку, супраціўляючыся пункту гледжання правіцы, пайшоў ён далей чым Яго Праасвяшчэнства і сцвердзіў, што пагражае яно „рэлігійнай вайной". Добра, што а. Місіюк адмежаваўся ад такіх вострых выказванняў. Я, вось, думаю, што рэлігійная вайна ў сувязі з гэтым не набліжаецца. Мабыць, будзе больш відочным усё большае асляпленне ды зацятасць беластоцкіх прадстаўнікоў правіцы (і, пэўна, не ўсяе), толькі, што горш, працягваецца яно ўсё з блаславенствам лакальнага Каталіцкага касцёла, які, прынамсі ў гэты момант, не рашыўся выказацца ў гэтай справе.

Мацей Халадоўскі

Сустрэча ў Гайнаўцы

Пазваніў мне Міхась Куптэль. — Прапаную сустрэчу карэспандэнтаў „Нівы", — заявіў. — Ці магу разлічваць на вашу прысутнасць? Я пакарыстаўся прапановай, паколькі кожная сустрэча пакідае ў маім жыцці мілы ўспамін.

Міхал Куптэль пражывае сярод палякаў на Прыбярэжжы. У Махнатае штогод летам прыязджае на адпачынак. Тут яго бацькаўшчына. Лічыць сябе беларусам. Не адмаўляецца ад сваёй тоеснасці. Пасылае допісы ў „Ніву". Гэта з ім на старонках тыднёвіка перакідваліся мы рэплікамі на тэму сучаснай рэчаіснасці і дэмакратыі. Дагэтуль не сустракаліся, не было нагоды. Тым больш ахвотна пракарыстаўся я ягоным запрашэннем.

24 ліпеня адправіўся я ў Гайнаўку — у Беларускі самаўрадавы форум, што па вуліцы Верабея. Але сустрэча аказалася асечкай. Не прыехалі астатнія карэспандэнты па важных асабістых прычынах. Праз нейкі час аставаўся я ў кампаніі двух Міхалаў — Андрасюка і Голуба. Ініцыятар сустрэчы з'явіўся ў той час, калі я збіраўся ўжо вяртацца дадому. Засталіся мы ўчатырох. За гарбатай хутка праходзіў час. Старшыня Беларускага самаўрадавага форуму расказаў аб кантактах гайнаўскай арганізацыі з адпаведнымі ўстановамі ў Беларусі.

— У выніку пагадненняў, дзесяціасабовая група гасцей з-за мяжы пабывала ў Гайнаўцы і Нараўцы. У канцы жніўня прыедзе наступная група. Наведае Нарву і пазнаёміцца з працай гміннага самаўрада. Зараз праводзім сустрэчы з камп'ютэрнымі заняткамі ў паасобных гмінах, — канстатаваў Міхал Андрасюк. — Хочам падрыхтаваць электарат да наступных выбараў. На спісках Беларускага выбарчага камітэта павінна апынуцца як найбольш кандыдатаў адданых беларускай справе. Ніякіх кааліцый не заключаем. Хто станоўча ставіцца да нашай праграмы, беларускай, значыцца, дык сардэчна вітаем.

Спадар Куптэль прапанаваў уключыць беспрацоўных з вышэйшай адукацыяй, якія б вялі лекцыі як валанцёры. Лічыўся б ім адно стаж працы (без грашовай платы).

Міхал Андрасюк адказаў, што не рашаецца на такі прынцып, паколькі ў гэтай справе няма адпаведных законаў. На гэта патрэбны час і дапрацаванасць тэмы. Зараз неабходна закончыць гміннае самаўрадавае абучэнне.

Непрыкметна прайшоў час. Мы з Куптэлем вярнуліся да палемікі на тэму сучаснай дэмакратыі і грамадскай справядлівасці ды ўваходу Польшчы ў структуры Еўрасаюза. Абодва прыйшлі да высновы, што ў новай рэчаіснасці ёсць шанц для беларусаў. Неабходна адно — як пазнаёміць грамадскасць на вёсках, каб адпаведна забрацца за гэтую справу. На думку прысутных, важную справу робіць тут Беларускі самаўрадавы форум.

Уладзімір Сідарук

Літаратурна-мастацкая старонка № 521

Дабравесце ад Міколы Раманавіча

Сніцца мне трывожнае: Мікола Гайдук, апрануты ўрачыста, як у сваю апошнюю дарогу пяць гадоў таму, з сівай бародкай, звяртаецца да мяне ў нейкай даліне, дзе поўна беларусаў, якім штосьці *даюць*, сваім голасам з характэрным тэмбрам, з папрокам: „Мірачка, а чаму ты работы не робіш?!" А якое работы? У апошні час рабілі мы былі разам праваслаўны „Фос", тарашкевіцай... Работа кожнаму свая... Яшчэ красавік 1984 года ўспомніў, з датай. Пра „Ніву" гэта, давялося шукаць, чаму. Але работы свае Мікола Раманавіч, працавіты, прагны да нянуднага жыцця чалавек, не закончыў. Пачатага шмат. Хоць бы той ніўскі краязнаўчы слоўнік, да літары Г...

Педагог ды аўтар падручнікаў, збіральнік роднага — фалькларыст, гарачы публіцыст, пісьменнік, які вяртаў вобразы мінулага, паэт ды перакладчык, — аднаго ягонага жыцця хапіла б на некалькі чалавек. Зможаны хваробай сэрца, ён да апошняе хвіліны быў перапоўнены планамі, кожны дзень у яго да апошняе хвіліны быў на подбежках, каб паспець. Калі падпісваў мне сваю апошнюю кнігу пра беластоцкія легенды, выдадзеную „Белавежай", летам 1998 г., цяжка ўздыхнуў: „Гэта мая апошняя..." Ды што вы, Мікола Раманавіч!

На магілцы Міколы Гайдука ўзведзены прыгожы помнік. Больш каштоўны пакінуў ён у беларускай літаратуры і журналістыцы. Пасля яго засталіся кнігі — свае і чужыя, архіўныя фотаздымкі, мноства машынапісаў, дакладна, акуратна раскладзеных па папках, нотныя запісы песень... Жонка Міколы Гайдука Лідзія ў 1999 г. перадала ў Беларускі музей у Гайнаўцы ўсю ягоную спадчыну. Гэта 1592 загалоўкі кніг (шмат якія па некалькі экземпляраў) — з гісторыі, этнаграфіі, мовазнаўства, мастацкай літаратуры, падручнікі, часопісы, газеты, артыкулы друкаваныя і не, апрацоўкі чужых тэкстаў, лісты яму і ад яго, плакаты, аб'явы, запрашэнні... Ёсць нават сшыткі вучняў ды студэнтаў, спісы алімпійцаў Бельскага белліцэя (імі вельмі ганарыўся, будучы ў мінулым ягоным дырэктарам). Асабістыя нататнікі, дакументы з арганізацый (разам з рэкамендацыямі) ды каляндарыкі. Асабліва шмат календароў — і адрыўных, і ў кніжачках, на розных мовах. Рукапісы Евангелля ад Мацвея — уласны пераклад. Здаецца, Мікола Гайдук нічога не выкідваў, пільнаваў, каб не прапала. Беражлівыя адносіны да „папераў" як сведкаў веку ды жыцця. Засталася нават спецыяльная нотная папера, з якой можна адклейваць паасобныя ноткі — маўляў, можа камусьці прыдасца. Таму, хто будзе *работу рабіць*. А не чакаць, што хтосьці штосьці дасць беларусам.

Міра Лукша

Мікола Гайдук

Мроі (1)

Калі б не сны і не мроі, пражыць было б немагчыма. Яны лякуюць нашую душу не горш князеўскага лекара-вянгерца.

Уся тая памятная ноч сотні разоў вярталася да Цюймы ў снах. Пад іх націскам ён варочаўся на ложы, стагнаў, енчыў, але соннае трызненне не сунімалася, няўмольным вастрыём літоўскага нажа ўпівалася ў левы бок яго грудзей. Тады Цюйма з дзікім выццём зрываўся з ложа, у бяспамяцтве саскокваў на гліняны ток падлогі і толькі ад холаду, што праймаў босыя ногі, прачынаўся і да яго вярталася рэчаіснасць. На крык убягалі ў святліцу служкі, пільна прыглядаліся свайму пану і, пераканаўшыся, што гэта яго мучаць сонныя мары, падкідвалі некалькі паленняў у прытухшы жар на паду і ціха вярталіся ў свае катухі. Цюйма жа, крыху ахаламаўшы ад сонных з'яваў, закручваўся на пустым шырокім ложы ў мяккую мядзведжую скуру, сачыў за жвавым полымем у коміне і намагаўся прагнаць ад сябе жудасныя начныя мроі. Але тыя то адплывалі некуды, то зноў крыўляліся палахлівымі ценямі па кутках святліцы і нагла скакалі перад вачыма.

І вось як на яве, якраз як тады, чуе Цюйма пераліўчаты напеў царкоўнага звана. Гэта напэўна кульгавы званар Шугай, што бабылём без роду і без племені туліцца каля царквы, па наказу айца Сафронія размерана цягае за вяроўку, прывязаную да сэрца звана. Чаша звана злёгку дрыжыць, пагойдваецца нават, а сэрца настойліва ўдарае ў рэбры-берагі і са званіцы па ўсёй крэпасці плыве, быццам кроў па целе, хвалісты струмень. Разбудзіўшы ўсіх у пасаднікавых харомах і грыдніцах, пераскоквае ён цераз высокую абаронную сцяну з дубовага бярвення і скочваецца з высокай крапасной гары ў пасад. Пагуляўшы там па цесных вулках і пераходах ды запаліўшы ў некалькіх шчылінах-акон-цах палахлівыя агеньчыкі, ён стрымгалоў кідаецца цераз вастраколле абароннага валу проста на водную гладзь Буга і шугае над ёю ў начной цемрадзі недзе ў нязведаную далеч.

— От жа ж гэты Сафроній! Яшчэ, здаецца, і першыя пеўні не прапяялі, а ён ужо на ўсеначную падымае! — бурчыць драгічынскі пасаднік Цюйма і паварочваецца на ложку да сваёй любай Чарнушкі. — Трэба ўсё ж уставаць. Не выпадае нам з табою спазняцца ў царкву. Людзі заўважаць і перагаворвацца пачнуць, што, глядзі, ужо тры месяцы як пасля шлюбу, а з ложа нават на вялікдзень вылезці не могуць, за любошчамі і свята не ўшануюць...

Раптам звон сціх, і ў зацягнутыя высушанымі свінымі пузырамі вузенькія акенцы ўдарыў прарэзлівы, шалёны крык. Не паспелі Цюйма і Чарнушка, сарваўшыся з ложа, ускінуць на сябе нешта з адзежы, як штосьці цяжка ламатнула ў дзверы харомаў і страшэнны хрып чалавека, якому ў горла ўлазіць лязо нажа, затрапятаў ля парога святліцы. Цюйма дрыжачымі рукамі намацаў на сцяне рукаяць баявой сякеры і, шапнуўшы жонцы: „Хавайся за маімі плячыма!", скокнуў да дзвярэй, стаў каля вушака, размахнуўся. Чарнушка выцягнула аднекуль паляўнічы нож. Праз момант дзверы расхіліліся і ад павеву ярчэй успыхнуў жар у коміне. У яго мігатлівым водбліску Цюйма ўбачыў на парозе свайго слугу Саца з выкручанымі назад рукамі, смяротным жахам у расшы-

Фота ЯЎГЕНІІ ПАЛОЦКАЙ

Мікалай Гайдук і Міра Лукша (1992 г.)

раных вачах і б'ючай чорным струменьчыкам крывёю з перарэзанай шыі. Яго нехта ўпіхаў, а сам хаваўся за плячыма. І Цюйма на момант завагаўся: не хацеў рубануць сякерай па Сацу. Гэтага хапіла, каб з-за шырокіх Сацавых плячэй прасунулася нечая рука і вастрыё нажа ядавіта ўпілося ў Цюймаў бок. У гэты ж момант яго сякера ўгразла ў нечыю голаў. Але тут жа штосьці цяжкае звалілася Цюйме на шыю, і ён заўважыў, што ўсім целам валіцца ў нейкую бяздонную прорву.

Ачнуўся Цюйма з пякучым болем у шыі і баку. Каля яго стаяў дваравы сабака, што сторажы трымалі для пільнавання яцвяжскіх нявольнікаў, і злізваў расплыўшую па глінянай падлозе карычневую лужыну. Перамагаючы востры боль, Цюйма павярнуўся на здаровы бок. Сабака забурчэў, аскаліўшы жоўтыя клыкі, і неахвотна падаўся ў дзверы. „Добра, што хоць не кінуўся на мяне, напэўна загрыз бы... — мільганула ў галаве Цюймы. — Гэта ж сабака яцвяга ўміг прыкончвае..." Стоячы ўжо на каленях, ён убачыў каля парога два застылыя целы: свайго слугі Саца і нейкага чужога воя з рассечанай галавой. Вакол стаяла мёртвая ціш. У святліцы са сцен зніклі вісеўшыя там заўсёды зброя і вопратка, з ложа — пасцель. Чарнушчына пасажная скрыня была перакулена на бок і свяцілася пустэчай свайго нутра. І тут Цюйме ўсё праяснілася.

— Ча-а-арну-у-ушка! — нягледзячы на страшэнны боль, закрычаў ён. — Чарнушка, дзе ты?!

Яму адказала цішыня. Ён зноў закрычаў, а потым яшчэ і яшчэ. Праз колькі часу, енчачы і стогнучы, прывалокся ў святліцу на ягоны крык званар Шугай. Наблізіўся да сядзячага ў крывавай лужыне Цюймы, агледзеў шыю і бок, узяўшы пад рукі, дапамог вылезці на сухое месца і пачаў сцягаць карзно, каб дабрацца да раны. Цюйма ад болю скрыгітаў зубамі.

Міра Лукша

Чобаты

Манька села на канапку. Як заўсёды, увалілася цяжка, панура, не азваўшыся ні словам на прывітанне. Расшпіліла зашмальцаваную балонневую куртку. Рукі склала на бурую спадніцу. Ногі ў грубых панчохах ды гумовых чорных чобатах выпрастала перад сабою, на памаляванай светла-карычневай фарбай непадмеценай падлозе. Канапка пад вузкім акном кухні Піліпчае, накрытая цыратай, аж застагнала пад грувасткім, буйным Маньчыным целам. Манька заходзіла да Піліпчае, управіўшыся, так як да іншых жывых вяскоўцаў, сядала моўчкі, пра нішто не пыталася, нічога не прасіла. Чакала.

— Ты што, Манько, ужэ ўправіласа? — запыталася Піліпча. — Ціпэр то паробіш зранку, ледзь рукі адмыеш, і зноў браццэ трэбо. Зіма ідзе.

— Жывы чалавек, то і рабіць трэбо, — памаўчаўшы, грудным голасам прамовіла Манька.

— Будзеш калоць?

— А што калоць, як у склепі купіць можно. Ровером пад'ехаць у гміну, ні так далеко.

— Або і ў аб'язном склепі, толькі нівэдомо, што там прывазут. Намашают у тые каўбасы ўселякаго гаўна, а ты — еш. То ж лепш свае свінчо ўкарміці. А то і Юлік прыедзе, кумпачок укіну, — бразгатала гаршкамі худзенькая, прыгорбленая Піліпча. — О, зупу вару. Грахоўку. Кавалок вандзонкі, і як смакуе.

— Каб то меў хто каму варыці! — басавіта прабурчала Манька.

— Бач, і мой памэр. Прыйшла пара.

— Добры чалавек быў.

— Добры, добры! — Піліпчай з-пад рукі звалілася покрыўка, пагрукатала па падлозе. — І для мане добры, і для цібэ добры! Ой, добры! Крый яго Божа!

— А калі гэто было!

— Што — калі! Усім вам Піліп то пэчы ставіў, то дахі крыў, то гараў. Добрэ гараў. О-то-то, лепш, чым на сваём.

Піліпча задыхалася. Бразнула апалонікам. З-пад хусткі выбіліся сівыя валасы.

— А што? Можэ, не?

— То ж гэтэ будзе... гэтэ самэ... Самые ж над магілаю стаімо! — Манька выцерла нос рукавом. — Піліп, твой чалавек... добры быў.

— Добры! Усім вам у дупу ўлазіў, бы ў хаці ні давалі!

Піліпча выцерла рукі, падышла да кута, стала чагось шукаць за іконкай.

Манька сваім звыклым рухам сарвалася з канапкі, не згінаючы кален. Мужчынскія чобаты, заляпаныя граззю, зашаграталі па падлозе.

Гэтыя чобаты Маньцы даў быў Піліп.

Віктар Швед

Лес і лёс

Памяці Міколы Гайдука ў пятую гадавіну з дня смерці

Любіў надзвычай лес Мікола,
Лес быў Яму царквой, прастолам
І адпачынкам у цянёчку.
Тут ягады збіраў, грыбочкі.
У дзянёк цёплы, вераснёвы,
Паехаў ён у лес сасновы.
Праз дзень грыбочкаў поўны кошык
Ставаўся непасільнай ношай.
І замарыўся ён да смерці
Са сваім надта хворым сэрцам.
Угледзелі Міколы вочы
Раптам яшчэ адзін грыбочак.
Стаў Мікола на калені,
Грыбок, здалося, мае ў жмені...
Ды раптам кроў застыла ў жылах —
Узяць грыб не хапіла сілы.
Убачыў толькі Бог з нябёсаў
Як спалучыліся лес з лёсам.

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Распачаўся школьны год

Распачаўся школьны год,
Цёплае мінае лета,
Шмат вясёлкавых прыгод
Сонейкам сагрэтых дзетак.

І ад рэк, палёў, лясоў,
Па спякотным адпачынку
Дзеці хлынулі ізноў
Да асвежаных будынкаў.

Маюць новы школьны клас
Маладыя непаседы.
Ім настаўнікі ў запас
Пераказваць будуць веды.

Працы ў школе заўжды шмат,
Усіх навук абсяг вялікі
Прысвойваць трэба акурат
Штодзённа да другіх канікул.

Ці ты любіш школу?

Запыталіся Міколу:
— Ці ты любіш сваю школу?
— Я люблю яе, вядома,
Лепш у школе мне, як дома.

Школа мае сэнс трывалы,
Школа скарб у нас вялікі.
Каб яна не існавала —
Не было б зусім канікул.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выхавацелька V „а" кл. Данута Яблонская віншуе выдатніка Марыюша Врублеўскага з ПШ н-р 4 у Беластоку. У Марыюша па-беларускай мове — шасцёрка!

Прывітанне, школьны год!

Канікулы, як і ўсё добрае, непрыкметна праляцелі. На памятку асталіся нам загарэлыя шчочкі і вясёлыя вочы. Многія да таго падраслі, што і не пазнаеш іх.

Дарагія сябры, „Зорка" вітае вас з новым навучальным годам! Традыцыйна ўжо будзем вам арганізаваць шмат конкурсаў і сустрэч. Спецыяльна вам мы прыдбалі многія ўзнагароды. У першую чаргу будзем прапанаваць беларускія кніжкі і пісьмовыя прылады.

У новым навучальным годзе будзем уважліва сачыць за вашымі дзеяннямі, поспехамі і мерапрыемствамі. Самыя цікавыя допісы надрукуем у „Зорцы".

Хочацца таксама пахваліць нашых найвернейшых сяброў, якія прысылалі допісы на працягу ўсіх канікул. Сярод іх — Пятрусь Герасімюк з Арэшкава. У пачатку навучальнага года Пятрусь атрымае ад нас беларускія кніжкі і іншыя ўзнагароды.

Усіх вас, шаноўныя чытачы „Зоркі", заахвочваем сябраваць з намі круглы год. Хай наша старонка, як і прыстоіць сапраўднай зорцы, надалей выпраменьвае вашы дзіцячыя думкі, радасці і спадзяванні.

Ганна Кандрацюк

Ніна Мацяш

Пастушок

„Уіць-уіць", —
у вярбовы свісток
Заіграў у куп'і пастушок.

Збоўтаў лапкай ваду ручая,
„Уіць, уіць! Гэй, пастушка мая,

Глянь, вячэрняя гасне зара,
Вырушаць у дарогу пара.

Кліч да гурту дзяцей, уіць-уіць!
Сібер хоча ручай наш зашкліць.

Каб мароз не заспеў тутка нас,
Выкіроўвацца час на Каўказ.

Цягам снежнай палескай зімы
Пасці зоркі ўжо там будзем мы.

А вясной, уіць-уіць, зноў сюды
Прывяду вас да роднай вады.

Уіць-уіць, да гнязда з асакі, —
Згэтуль род жа ўвесь наш, пастушкі.

І пакуль будзем жыць, уіць-уіць!
Уіць-уіць, уіць-уіць, уіць, уіць-уіць!.."

Мар'ян Дукса

Не спяшайся, восень

Штосьці ад бярозы
лісце адлятае.
Кажуць, у дарозе
восень залатя...

Ты ўсё бліжэй, бліжэй —
не спяшайся, восень.
Ты прыходзь тады ўжо,
як пажнём, пакосім,

бульбу пакапаем,
кошыкамі зносім.
Хлебным караваем
стрэцім цябе, восень.

Як дабро палічым,
у засекі звозім —
мы цябе паклічам,
мы цябе папросім.

Эмілька

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У Цэнтральным аглядзе „Роднае слова" выдатна выступілі навучэнцы з Орлі.

Эмілія Сахарчук падрыхтавала верш Васіля Віткі. Чацвёртакласніца прадставіла публіцы жартаўлівы верш пад загалоўкам „Сарочыны бліны". У час перапынку Эмілька выявіла свой вясёлы характар, разам з сябрамі яна прыдумвала ўсялякія гульні. Мітусіліся не толькі навучэнцы з Орлі, але і многія іхнія аднагодкі. У гульні былі скарыстаны косы дзяўчынкі, за якія патузвалі зухаватыя хлапчукі.

Зорка

Казкі дзяцей Беларусі

Адкуль у аленя рогі з'явіліся

У вялікім цёмным лесе жыў статак аленяў. Былі яны вельмі дружныя: мацнейшыя заўсёды дапамагалі слабейшым, аберагалі іх, клапаціліся адзін аб адным. Але, як нярэдка бывае, знайшлася нячыстая сіла, якая захацела ўнесці разлад у дружную сям'ю. І вось што з гэтага выйшла.

Злая лясная вядзьмарка вельмі зайздросціла жыццю аленяў, а больш за ўсё не любіла важака статка. Ён быў прыгожы, стройны, мужны і магутны. І сэрца ў яго добрае. Таму яна і зачаравала аленя. Упаў той і заснуў моцным сном, а калі прачнуўся, адчуў на галаве нейкі цяжар. Ён падбег да ляснога возера, зірнуў у ваду і ўбачыў на сваёй галаве раскідзістыя рогі. Вельмі засмуціўся важак статка, не ведаў, што рабіць, бо да таго часу алені рагоў не насілі. Не пайшоў ён у статак, баючыся, што з яго будуць смяяцца, а стаў хавацца па глухіх хмызняках, у адзіноце гараваць пра свой недарэчны выгляд.

Аднойчы да статка аленяў сталі падкрадацца ваўкі. Важак быў непадалёку, і яго сэрца адчула бяду. Як страла памчаўся ён да стойбішча сяброў. Раз'юшаны, падбег да вайкоў і пачаў біць іх сваімі магутнымі рагамі. Ваўкі, спалоханыя яго незвычайным выглядам і пабітыя яго рагамі, уцяклі прэч, каб больш ніколі сюды не вяртацца. А важак аленяў разгублена стаяў пасярод паляны, і ўсе алені з цікаўнасцю разглядалі яго рогі. Але гэта працягвалася ўсяго некалькі хвілін. Першая аленіха-прыгажуня статка падышла да яго і стала побач. Удзячнасцю і ласкай свяціліся яе вочы. Яна прызнала важака... А за ёю і астатнія алені абступілі яго і сталі дзякаваць яму за выратаванне ад ваўкоў.

Так важак вярнуўся ў сваю сям'ю, а ўсе іншыя алені сталі зайздросціць яго прыгожых раскідзістых рагоў. А неўзабаве рогі павырасталі і ва ўсіх аленяў.

Паліна Шаўчэнка, Мінская вобласць, Семяновіцкая СШ

Казка пра цудоўную галінку

Жыў багаты купец і былі ў яго тры дачкі. Аднойчы купец ад'язджаў на кірмаш, а дочкі давалі яму заказы. Старэйшая просіць новую сукенку, малодшая шаўковую хустачку, трэцяя — галінку арэшніку. Паехаў у горад бацька, купіў усё што трэба — толькі галінкі не можа знайсці. У зваротнай дарозе сустрэў ён старца, які нёс галінку арэшніку. Пачаў купец прасіць, каб той прадаў яе.

— Яна не на продаж, — адказаў стары, — магу яе толькі падарыць, калі аддасі сваю дачку замуж за майго сына.

Купец задумаўся, у канцы рашыўся ўзяць галінку.

Дочкі ўцешыліся падарункамі, апрануліся і пайшлі на танцы. Толькі наймалодшая ў хаце засталася, не апрануцца ж у галінку арэшніку!

Паставіла яна галінку на акне і глядзіць на яе. Як толькі прыйшоў вечар, зашумела ўсё, загудзела — прыляцеў Фенікс — Ясны Сокал, ударыўся аб зямлю ды стаў маладцом, — што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць. Маладыя прагаварылі ўсю ноч. Адну, другую, трэцюю. Аж урэшце сёстры не сцярпелі, узялі ды на акно вострых нажоў панастаўлялі.

Як толькі прыйшоў вечар, сокал ударыўся аб акно і абрэзаў правую ножку.

— Цяпер не хутка мяне пабачыш, — сказаў дзяўчыне і адляцеў за сёмае мора, за сёмыя горы.

Пайшла дзяўчына ў свет. Ішла яна доўга ці каротка, аж бачыць: хатка на курыных лапках стаіць. Усярэдзіне Баба Яга.

— Фу-фу, чалавечае мяса чую, — зазлавала Яга. — Куды, прыгажуня, ідзеш, ды навошта спакой мой парушаеш?

Расказала аб усім дачка, заплакала.

— Спяшайся хутчэй, — сказала Яга, — твой Сокал другую пакахаў, хутка вяселле ў іх.

Яшчэ на дарогу дала Яга дзеўцы залаты яблык, залаты бранзалет і залаты пярсцёнак.

Ішла дзяўчына, ішла, мінула цёмны лес. Бачыць — сады, двор прыгожы, кветкі. Просіць, каб яе туды пусцілі Яснага Сокала пабачыць. На дарогу выйшла саперніца, тая што за Сокала замуж збіралася.

— Аддай залаты яблык, — загадала, — тады пабачыш яго.

Дзяўчына аддала яблык. Прыйшла ў палац, бачыць — спіць маладзец.

На другі дзень аддала саперніцы бранзалет, а на трэці — пярсцёнак. Яна прыйшла ўжо апошні раз паглядзець на свайго любага. Той усё спаў і спаў, саперніца яго зачаравала, сон навяла.

Заплакала-загаласіла дачка. І раптам стаўся цуд! Адна гарачая сляза ўпала на яго лоб і хлопец прачнуўся. Убачыў Ясны Сокал сваю любую.

Пасля яны пажаніліся і сталі жыць-пажываць. Магчыма, што і цяпер жывуць, вось як бывае.

(гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Народныя касцюмы навучэнцаў беларуска-польскага прадшколля ў Беластоку. Вышыўкай займаліся матулі дзетак

Скарб

У бабуліным куфры ляжаць звалькі палатна, выбеленага льну, кужалю, канапляныя шэрыя, жорсткія кавалкі, з якіх можна пашыць мяшок ці матрац, у якія напіхалі салому ці сена, а і вышываныя блузкі, фартушкі, ручнікі. Гэта быў, быццам бабулін пасаг. Чамусьці ніхто гэтым не карыстаўся. Можа, мода не тая, як кажа суседка Маня, а яна ў модзе разбіраецца, глядзіць заходнія фільмы. Мама Агніі не вельмі цікавілася тымі цудамі. Куфар стаіць на гарышчы, завалены дошкамі, плеценымі косамі цыбулі ды пукамі запыленага зелля. Тое зелле, мабыць, збірала яшчэ бабка, або і яе сястра, вельмі старэнькая ўжо, маміна цёця Вера. Бабку ўжо пахавалі, не памятае яе Агнія, але бабулька Вера час ад часу прыязджае ў госці на сваю радзіму, у дом, у якім вырасла і з якога выдалі яе замуж у далёкі Ліпск над Бобрай. А ў гасцях — хто будзе лазіць па гарышчы? Тым больш калі ты з кульбачкай ходзіш? Агніі смешна — у школе на яе кажуць Агнешка, а баба Верка жартам называе яе... Ягняткам. Бо ў Агніі ўся галава ў кудзерках, сапраўдны залаты баранчык...

Прыехала баба Верка, а тут — рамонт у хаце. Усё мяняюць — і абшыўку звонку, і ўсё ў сярэдзіне. Найцішэйшае месца — пакуль — на падстрэшку. А і тут збіраецца „Ягняткаў" тата Адам парадак зрабіць. Парадак, паводле яго — усю непатрэбшчыну, вось, спляжыць, выкінуць. Спаліць, вывезці на гмінны сметнік. Замітусілася баба Верка, сваю кульбачку кінула на падворку, і пакараскалася з дваюраднай унучкай на падстрэшак па досыць выгаднай драбіне з шырокімі прыступкамі.

Адвалаклі дошкі, паскідалі вянкі цыбулі і нейкія шматы. Куфар блісну ў каваным векам. Адчынілі яго без ключа — замок быў паламаны.

— Вось, урэшце! — пляснула ў паморшчаныя далоні бабка Верка. — Глянь, мой пасаг! Не даў мне мой тата гэтага куфра, майго прыдання, бо пасварыўся са сватам, значыць, з маім свекрам. Не дагаварыліся наконт чагосьці, ужо не помніцца мне... Давай, Ягнятка, прымераем... А мае каралі!..

Агнія накінула сабе праз галаву цёмна-сіні саян з фіялетавымі паскамі знізу. Затрымаўся на стане.

— Бач, Ягнятка, і я такая тоненькая была! Бяры кофту!

Агнія старалася злазіць па драбіне як найбольш дастойна ў новенькім, хоць старым ільняным адзенні, у чырвоных пацерках, што путаліся ёй аж на жываце. А за ёю задам спускалася баба Верка, і смяялася. А на падворку дык разрагаталіся абедзве.

— Во, наследніца! — з гонарам паглядзела на дзяўчынку бабуля.

Міра Лукша

Оля

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Оля Заборская з Беластока — вучаніца ПШ н-р 4 — дэкламавала верш Алеся Бадака „Вецер і шарык". Выступленне Олі вельмі спадабалася „Зорцы". Дзяўчынка, нягледзячы на далікатны сюжэт твора, здолела раскрыць шматколернасць і эмацыйнасць верша. Волечка дакладна прадумала кожны радок, яна цікава адлюстравала страсці гераіні і прыроды.

Оля Заборская атрымала вылучэнне ў Цэнтральным конкурсе „Роднае слова 2003".

Зорка

Вясёлы куточак

— Якая розніча між электрычным і сонечным святлом?

— За сонечнае не трэба плаціць.

* * *

Малое дзіця працягла і голасна плача ноччу. Ягоны старэйшы брацік пытае маму:

— Адкуль у нас узялося такое крыклівае дзіця?

— Яго нам прынёс бусел з Афрыкі.

— То цяпер там напэўна цудоўная цішыня!

* * *

Графіня пытае свайго агародніка:

— Што вы робіце з гэтымі агіднымі вусенямі?

— Кожную вясну збіраю іх з лістоўя, нясу ў агарод суседзяў, абарочваю сем разоў вакол галавы і выпускаю. Ім так закруціцца тады ў галаве, што не знаходзяць дарогі назад.

* * *

Маці Янкі наракае суседцы:

— Страшнае лета маем у гэтым годзе: усё ліе і ліе!

— Дождж патрэбны, — адказвае суседка. — Агародніна зеляніцца, у полі расце збожжа...

— Але гэтае балота! Учора мне трэба было выкупаць чацвёрку дзяцей, каб пазнаць, каторы мой Янка.

Польска-беларуская крыжаванка № 36

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 32: Пажар, эскіз, слуп, пераклад, Орля, доктар, Ас, аранж, сук. Спадар, жэле, урок, рэпартаж, клас, акуляр, задатак. **Кніжную ўзнагароду** выйграў **Пятрусь Герасімюк** з Арэшкава.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Капэла „Хутар" з Гарадка

Вясельныя песні ў Ялоўцы

У Ялоўцы (Міхалоўская гміна) дагэтуль яшчэ чагосьці такога не было. У нядзелю, 24 жніўня гэтага года цікавае культурна-забаўляльнае мерапрыемства адбылося дзякуючы намаганням раднага гміны і адначасова светліцовага Пятра Дамброўскага і культурнага дзеяча Мар'яна Гайдучэні. Яны пры дапамозе дырэктаркі Гміннага цэнтра культуры ў Міхалове Анны Дабравольскай арганізавалі першы ў гміне Агляд вясельных капэлаў.

На сцэне з беларускімі ды польскімі вясельнымі песнямі выступілі калектывы з Ялоўкі (ён не мае яшчэ назвы), „Хутар" і „Асенні ліст" з Гарадка, салістка „Хутара" Ларыса Абрамовіч, фальклорны гурт „Каліна" з Залукаў, а таксама інструментальна-вакальная капэла Яна Карповіча з Гарадка. Парай маладых выступілі Міхал Карэцкі з Кандраткаў і Рэгіна Мялько з Ялоўкі.

Выступы капэлаў на нейкі час спынілі конкурсы. Адбыліся выбары прыгажуні і прыгажуна лета 2003 у двух катэгорыях — да і звыш 15 гадоў.

На заканчэнне імпрэзы да танца іграла гарадоцкая капэла.

— Вось, каб было больш такіх мерапрыемстваў, — уздыхалі дзяўчаты з Ялоўкі ды навакольных вёсак: Кандраткаў, Шымкаў, Лявонавічаў і Луплянкі.

Арганізатары абяцалі часцей ладзіць імпрэзы на паветры і ў свежаадноўленай святліцы.

Янка Целушэцкі

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Вясельная капэла з Ялоўкі

Кляшчэлеўскія святкаванні

Сёлетнія Дні Кляшчэляў праходзілі ў двух турах — 2 і 24 жніўня. Спачатку сустрэліся члены Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі. З гэтай нагоды ў царкве ў Дабрывадзе прайшло богаслужэнне, а затым сабраныя пераехалі над Рэпчыцкае вадасховішча, дзе пры вогнішчы і гарачай каўбасцы паглядзелі мастацкую частку ў выкананні мясцовых самадзейнікаў.

Асноўныя святкаванні праходзілі 24 жніўня. Жыхары горада не маюць шчасця да імпрэз як у мінулым годзе, так і зараз. Неба закрывалі хмары, зацягала холадам. Нягледзячы на надвор'е, купцы ўжо зранку ставілі ларкі з цацкамі, марожаным і півам. Прадпрымальнік з Любліна прыехаў з надзіманымі цацкамі, дзе за адзіныя чатыры злоты малечы маглі паспускацца „з горкі" ці паскакаць удосталь. Сёлетняя імпрэза была арганізавана пры саўдзеле Галоўнага праўлення Беларускага таварыства як беларускі фэст.

У 13 гадзін на спартыўнай пляцоўцы пачалося спаборніцтва пажарных каманд за кубак бурмістра горада. Удзельнічала ў ім чатыры каманды дабравольцаў і дзве маладзёжныя: хлопцаў і дзяўчатак. Пераможцам аказаліся гаспадары. Чарговыя месцы занялі пажарнікі з Дашоў і Палічнай. Усе яны атрымалі пераходныя кубкі бурмістра. Пажарнікі з Сакоў, як і юныя пажарнікі задаволіліся ганаровымі граматамі.

У 16 гадзін пачаўся матч паміж футбольнымі камандамі Кляшчэляў і Юхнаўца. Да перапынку перамагалі гаспадары (4:0). Нечакана выпаў дождж. Хто дзе мог, там хаваўся. Мы з 78-гадовым жыхарам Дабрывады Аляксандрам Рачкевічам схаваліся пад раскідзістымі кустамі на суседніх сенажацях.

Паколькі на 17 гадзін назначаўся канцэрт, дык я падаўся ў напрамку купальнага басейна. У гэтым годзе сцэну паставілі над вадою.

Прысутных прывітаў бурмістр Аляксандр Сяліцкі. Мерапрыемства ўдастоілі — віцэ-консул РБ у Беластоку Аляксандр Харытонаў, старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі і галоўны спонсар мерапрыемства, уласнік фірмы „Węgiel" Валянцін Гушч. Пасля афіцыйных выступленняў вядучая Яўгенія Казімярук выклікала на сцэну калектыў „Лучына". У іх выкананні прагучалі песні „Ехаў Ясь на кані", „Ой, на горы дождж ідзе", „Два дубкі" і „Там у полі азярэчка". У час выканання першага нумара, зноў сыпнуў дождж.

Танцавальная група з Гродна запрэзентавалася вальсам. Публіка была пад уражаннем цудоўных убораў як і мастацкага выканаўства. Я паглядзеў яшчэ выступленне калектыву „Heavens" з Гайнаўкі. Песні „І ты прымак, і я прымак", „Ой, бяда" ці „Kawiarenki" так падбадзёрылі публіку, што побач на зялёнай траўцы закружыліся танцоры.

Канцэрт працягваўся. Зноў заносілася на дождж. Я вымушаны быў пакінуць вясёлую кампанію ў поўным разгары забавы. А на выступленне чакалі „Прымакі", „Лідэр", „Каліна" з Дашоў і мясцовая „Тырса".

Праязджаючы побач стадыёна, кінуў я позіркам на апошнія мінуты матча. — Які рэзультат? — запытаў сустрэтага балельшчыка. — Сем да аднаго, — з усмешкай адказаў прыяцель.

Канцэрт закончыўся а восьмай вечара. Пасля кароценькага перапынку ў неба ўзляцелі рознаколерныя феерверкі. Так пачалася забаўляльная частка святкавання Дзён Кляшчэляў. Моладзь гуляла на дыскатэцы, хаця надвор'е не надта спрыяла забаве пад адкрытым небам.

Уладзімір Сідарук

Дубічы-Царкоўныя

Музей у школе

У драўляным будынку старой школы ў Дубічах-Царкоўных (Гайнаўскі павет) узнікае Рэгіянальны музей беларускай культуры і гісторыі (на здымку).

— У музеі пакажам турыстам гісторыю нашых зямель, — кажа войт гміны Анатоль Паўлоўскі. — У старым аб'екце ёсць новыя вокны і гонта. Заказалі яшчэ новыя аканіцы. Будзе тут, між іншым, кухня, а ў ёй печ для пячэння хлеба. Будуць кросны. Можна будзе кожнаму спрабаваць ткаць найпрасцейшы ўзор тканіны.

У адным з пакойчыкаў будзе драўляны ложак з пярынай і пухавымі падушкамі, да таго стол накрыты ўручную вышываным настольнікам ды сурвэткамі, а на сценах — іконы.

У музеі будуць экспанавацца старыя дакументы і фотаздымкі, карціны. Можна будзе агледзець даўнія прылады і макаткі. Асобнае месца будуць займаць вырабы з саломы або ракіты ды іншае рукадзелле.

(яц)

Бібліятэцы ў Чыжах — 50

7 верасня г.г. Публічнай бібліятэцы ў Чыжах (Гайнаўскі павет) споўніцца роўна 50 гадоў. Сведчыць аб гэтым запіс у інвентарнай кнізе, якую вядзе бібліятэкарка Галена Стоцкая.

Цяпер кнігазбор Гміннай публічнай бібліятэкі (ГПБ) налічвае 8 580 кніжак, у тым ліку 448 на беларускай мове (у 2001 г. было іх 805). Найбольш сярод іх мастацкай літаратуры. Беларускія кніжкі пастаянна чытае пяць асоб. Кніжкі падарылі бібліятэцы м.інш. Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" ды асабіста „белавежац" Віктар Швед.

Сёлета яшчэ не куплялі новых кніжак. Восенню ГПБ атрымае на выдавецкія навінкі 1 — 2 тысячы злотых.

Цешыць факт, што ГПБ робіць падпіску на „Ніву", якая многа гадоў знаходзіцца на бібліятэчнай паліцы.

У ГПБ даволі прасторна, выгадна (яна знаходзіцца ў цэнтры вёскі). Ёсць выдзелены пакойчык з падручным кнігазборам. Тут можна знайсці патрэбныя інфармацыі з розных галін ведаў.

Варта адзначыць, што ў час канікулаў ГПБ арганізавала дзеткам пластычныя конкурсы. Яны выконвалі рысункі на тэму: „Мая вёска летам", „Мой дом", „Кветкі, якія я люблю", а таксама рысавалі ўлюбёных герояў прачытаных кніжак. На заняткі прыходзіла шмат дзетак.

Янка Целушэцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Архіепіскапа Хрыстадула (стаіць злева) і мітрапаліта Саву (справа) прывіталі гайнаўскія вернікі

Трымайцеся праваслаўнай традыцыі

Архіепіскап Афінаў і ўсёй Грэцыі Хрыстадул з 16 па 22 жніўня г.г. пабываў у Польшчы па запрашэнні мітрапаліта Савы. Прымаў ён удзел у богаслужэннях на Святой Гары Грабарцы, сустракаўся з дзяржаўнымі, царкоўнымі і самаўрадавымі ўладамі.

Спачатку грэчаскі першаіерарх маліўся ў варшаўскіх цэрквах св. Марыі Магдаліны і св. Іаана Лесвічніка, спаткаўся з прадстаўнікамі польскага ўрада. На Святой Гары Грабарцы ўдзельнічаў у святкаваннях Праабражэння Гасподняга. Пасля сустрэўся з беластоцкімі вернікамі ў Мікалаеўскім саборы, Свята-Духаўскай царкве і храме Агія Сафія. У Супрасльскім манастыры архіепіскап паабяцаў хадайнічаць за фінансавай дапамогай на адбудову Дабравешчанскай царквы.

У Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы госця віталі святары Гайнаўскага і Кляшчэлеўскага благачынняў, самаўрадавыя ўлады і вернікі. Гайнаўскі сабор захапляе візантыйскай архітэктурай і роспіссю ўсярэдзіне храма. Нашы іерархі паказалі грэцкаму госцю працу яго земляка, які некалькі гадоў прыязджаў у Гайнаўку і за невялікай аплатай выконваў сценныя фрэскі.

— У гэтым храме адчуваю духовую радасць, — сказаў архіепіскап Хрыстадул, гледзячы на распісаныя сцены сабора. — З нашай і вашай культурнай спадчыны ўзнікла еўрапейская цывілізацыя. Адбываецца яднанне Еўропы на эканамічным, сацыяльным і вайсковым фоне. Цешыць, што ўступаючыя ў Еўрасаюз краіны — хрысціянскія, а Кіпр і часткова Польшча — з праваслаўнымі вернікамі. Калі чарговымі членамі Еўрасаюза стануць балканскія краіны, будзе яшчэ больш праваслаўных. Аднак не адным хлебам будзе жыць чалавек. Не эканоміка самая важная ў жыцці. Трымайцеся багатай праваслаўнай традыцыі, а зможаце супрацьстаяць цяжкасцям.

Архіепіскап перадаў праваслаўным вернікам блаславенства ад Грэчаскай царквы і народа ды ўручыў епіскапу Гайнаўскаму Мірану напрастольны крыж.

— Многія ў нас застаюцца без працы і мусяць клапаціцца каб здабыць хлеб. Вы гаворыце, што можа будзе лепш у Еўропе. Няхай здзейсняцца гэтыя словы, — заявіў епіскап Міран і перадаў госцю ікону Божай Маці.

Архіепіскап Хрыстадул наведаў яшчэ Яблачынскі манастыр, царкву ў Любліне і канцлагер у Майданку. На Хрысціянскай тэалагічнай акадэміі ў Варшаве атрымаў званне доктара honoris causa.

Архіепіскап Хрыстадул нарадзіўся ў 1939 годзе ў Грэцыі. У 1962 годзе атрымаў званне юрыдычнага магістра, у 1967 годзе — магістра тэалогіі, а пасля — доктара тэалогіі. Добра ведае французскую і англійскую мовы, размаўляе на італьянскай і нямецкай мовах. Архіепіскапам Афінаў і ўсёй Грэцыі з'яўляецца з 1998 года. Зараз Грэчаскую царкву складаюць Афінскае архіепіскапства і 80 мітраполіяў. У Грэцыі каля 11 мільёнаў вернікаў, амаль 7 тысяч храмаў і 200 манастыроў.

Аляксей Мароз

Шагал у Любліне

Больш за семдзесят арыгінальных графічных работ Марка Шагала, што належаць Віцебскаму музею мастака, адпраўлены ў Польшчу.

У пачатку верасня яны будуць у Любліне. Творы адносяцца да розных перыядаў творчасці вялікага майстра, аднак аб'яднаныя адной тэмай. Усе яны так ці інакш адлюстроўваюць біблейскія сюжэты ці персанажаў Старога і Новага Запаветаў.

Спецыялістаў з Люблінскага музея зацікавіла незвычайная падача матэрыялу — практычна ў кожнай рабоце ёсць месца роднаму гораду Шагала Віцебску.

На адкрыццё выставы ў Люблін паабяцала прыехаць унучка мастака Мэрэт Мэер Грабер, якая на працягу многіх гадоў займаецца папулярызацыяй творчасці свайго славутага дзеда. Гэта першая далёкая паездка віцебскага музея з работамі Шагала.

http://www.tvr.by, 29.08.2003 г.

У намоленым месцы

На свята Праабражэння Гасподняга ў Дзмітрыеўскую царкву ў Саках прыбылі паломнікі з Беластока, Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі і іншых мясцовасцей. Вернікі з навакольных вёсак прыбылі роварамі або пехатою. Машыны шчыльна запоўнілі плошчу перад царкоўнай агароджай.

Усяночную багаслужбу і галоўную літургію ўзначаліў кляшчэлеўскі дэкан, мітрафорны протаіерэй Мікалай Келбашэўскі. Сярод святароў быў настаяцель Рыбалаўскага прыхода, мітрафорны протаіерэй Грыгорый Сасна, гайнаўскі дэкан, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч і ігумен Дзмітрыеўскага мужчынскага манастыра Варсанофій (Дарашкевіч). У царкву ў Саках, крыху прызабытую апошнімі гадамі, раней прыбывалі паломнікі з аддаленых нават на некалькі дзесяткаў кіламетраў мясцовасцей. Ігумен Варсанофій успомніў, як старыя жыхары Гарадка расказвалі пра асаблівае месца ў Саках ды хадзілі маліцца ў Дзмітрыеўскую царкву. На намоленым месцы ў Саках сустракаліся паломнікі з Бельшчыны і Гайнаўшчыны.

— Пасля ўсіх гэтых расказаў з дзяцінства мне хацелася трапіць у гэтае месца і мае намеры здзейсніліся, — заявіў ігумен Варсанофій.

Айцец Міхаіл Негярэвіч дзяцінства і маладосць правёў у суседняй вёсцы — Сухавольцах. У Дзмітрыеўскую царкву ён прыязджаў тады і зараз ахвотна ў яе вяртаецца. Айцец Варсанофій заявіў, што велікамучанік Дзмітрый кіруе манастыром. Гэта з-за яго заступніцтва манастыр узнік, дзейнічае і разбудоўваецца. Калі іераманахі Варсанофій і Пётр прыехалі ў Сакі з блаславенствам мітрапаліта Савы, не было для іх асобных начлежных месц. Аднак прыняла іх спадарыня Люба Рашчэнка.

— Калі накіравалі да мяне святароў, я спачатку рашылася адмовіцца прымаць іх на жыхарства. Калі пасля літургіі падышла да айца Варсанофія з намерам сказаць аб гэтым, усё памянялася. Я згадзілася, каб яны жылі ў мяне, — заявіла Люба Рашчэнка.

Зараз гатуе яна ў манастыры ежу манахам. Парафіяне перакананы, што велікамучанік Дзмітрый спрычыніўся адкрыццю манастыра. Радныя Кляшчэлеўскай гміны нядорага прадалі будынак і плошчу закрытай школы ў Саках. Самім вернікам цяжка было б утрымаць манастырскі будынак. Дапамагаюць ім у гэтым паломнікі з Польшчы і замежжа, асаблівая з Грэцыі, куды часта ездзіць ігумен Варсанофій. Спачатку манахі прыспасобілі для сваіх патрэб толькі невялікія школьныя залы — у гімнастычнай зале зрабілі часоўню. Пасля да часоўні далучылі яшчэ некалькі школьных залаў і сталовую. Тут манахі моляцца ў будныя дні ды харчуюцца, а літургіі служаць у Дзмітрыеўскай царкве. Нават каталікі падтрымліваюць манастырскае жыццё — адзін з іх нядорага прадаў участак зямлі каля царквы. Манахі думаюць пабудаваць на ім манастырскі дом. Мяркуюць таксама, што ўзрасце зацікаўленасць паломнікаў ды хочуць дакупіць зямлі пад стаянку для машын. Колькасць нядзельных наведвальнікаў усё ўзрастае — дзеля іх служацца дадатковыя малебны ды чытаюцца акафісты перад іконай святога велікамучаніка Дзмітрыя Салунскага.

На Спаса пасля поўначы служылася першая літургія. Прынялі ў ёй удзел паломнікі з далёкіх ад Сакоў мясцовасцей, бо яны рашыліся вярнуцца дамоў ноччу. Раніцай святары і вернікі асвяцілі ваду ды чыталі акафіст да велікамучаніка Дзмітрыя Салунскага. Яго ікона знаходзіцца за прастолам. Выносіцца яна на сярэдзіну царквы толькі ў час святкаванняў у яго гонар. Другая ікона з часцінай мошчаў святога Дзмітрыя знаходзіцца на аналоі — да яе прыкладаюцца вернікі. Пасля літургіі быў хрэсны ход. Святары асвяцілі яблыкі і грушы. Старэйшыя вернікі да Спаса ўвогуле не ядуць фруктаў — чакаюць блаславення. Айцец Мікалай Келбашэўскі ў завяршальнай пропаведзі яшчэ раз адзначыў, што гэта святы Дзмітрый прыцягвае вернікаў на сваю горку. Вакол адрамантаванай і прыгожай драўлянай царквы сабралася мноства вернікаў, але даканчыць пропаведзь памяшаў дожджык. Прыхаджане, іхнія госці ды паломнікі сталі адпраўляцца дамоў. На намоленым месцы засталіся яшчэ тыя, хто хацеў памаліцца сам-насам.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вернікі вакол Дзмітрыеўскай царквы

Да ўвагі чытачоў

У дапаўненне да анатацыі кнігі „Супрасльскай душы пяянне" („Супрасльскі паэтычна-гістарычны зборнік", „Ніва" № 34 ад 24.08.2003 г.) паведамляем, што згаданы зборнік можна набыць у крамцы Супрасльскага манастыра і кіёску Брацтва праваслаўнай моладзі пры Свята-Мікалаеўскім саборы ў Беластоку. Кніжку варта купіць нават таму, што такім чынам можна даць узнос на аднаўленне Дабравешчанскай царквы ў Супраслі, паколькі Аўтарка і Перакладчык увесь тыраж перадалі бясплатна на гэтую мэту.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Іверская часоўня (на першым плане) і вароты на Чырвоную плошчу

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Сцены Крамля

У Расіі

У Маскве і наваколлі

У Маскве прыцягвала ўвагу новая архітэктура і нахабная рэклама. Некаторыя плакаты займалі больш за палову будынка, на якім віселі. Каля станцый метро адны хадзілі абклееныя рэкламай, а іншыя раздавалі лістоўкі. Многія нядаўна пабудаваныя дамы не ўпісваюцца ў сацрэалістычную архітэктуру старых камяніц. Аднак шматлікія заходнія прадпрыемствы, якія знайшлі ў Расіі новы рынак для сваіх тавараў, рашыліся адкрываць офісы менавіта ў гэтых новых памяшканнях. Яны значна лепш прэзентуюцца на ўскраінах горада, на фоне прыроды. Зараз у многіх месцах Масквы будуюцца новыя хмарачосы — галоўным чынам пад гаспадарчую дзейнасць. Іх уласнікамі найчасцей замежныя прадпрыемствы. Краіна адкрылася на замежныя інвестыцыі ды ўзнікае ў ёй шмат фірмаў з замежным капіталам. Працу ў іх знаходзяць часта расіяне. Будова рыначнай гаспадаркі спрычынілася ўвальненням з працы і росту беспрацоўя. Людзі з аддаленых гарадоў прыязджаюць у Маскву і знаходзяць тут працу ў будаўніцтве і прамысловасці. У Маскве лепш чым у іншых гарадах зарабляецца. Таксіст, з якім мы ехалі ў Маскву, сказаў, што зараз у работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў нізкія зарплаты, нізкія таксама пенсіі. Ён, як вайсковы лётчык на пенсіі, атрымлівае 130 долараў. Невялікія зарплаты і ў настаўнікаў, але яны могуць падзарабіць дадатковымі ўрокамі. Лепш маюцца лекары — прыватнае лячэнне дарагое. Цэны на прадукты ў крамах толькі крышку ніжэйшыя за нашы. Намнога таннейшыя затое камунальныя паслугі, вада і ацяпленне. Удвая з паловай таннейшы бензін. Па Маскве ездзяць элегантныя заходнія машыны. Многа таксама старых машын, якіх прывезлі з Захаду турысты. Пасля ўвядзення высокага падатку на імпарт машын расіяне больш зацікавіліся сваёй вытворчасцю. Мой суразмоўца ездзіць на „Волзе". У будучыні хоча купіць такую ж машыну ды прыспасобіць яе да газу. Прафесія таксіста яго задавальняе. Ён таксама станоўча ацэньвае перамены ў Расіі і дзейнасць яе прэзідэнта Уладзіміра Пуціна.

— Пакуль не бачу я іншых за яго кандыдатаў на гэты пост. Добра, што займаецца ён унутранымі справамі краіны, не ўмешваецца ў іракскі канфлікт ды іншыя збройныя акцыі ў свеце, — заявіў таксіст.

Крытычна ацаніў ён дзеянні амерыканскай арміі ў свеце ды збліжэнне Польшчы з Захадам. Адчувалася ў яго настальгію па ранейшым парадку ў свеце, у якім Савецкі Саюз быў суб'ектам сусветнай палітыкі. Многія расіяне крытычна ставяцца да дзейнасці свайго ўрада. Спрычыніліся гэтаму гаспадарчы заняпад і продаж дзяржаўнай маёмасці прыватным прадпрымальнікам. Шмат расійскіх прыватных грошай у банках заходніх краін.

У аддаленых ад Масквы мясцовасцях (адно такое мястэчка я наведаў) прамысловасць амаль знікла. Людзі вымушаны пераязджаць за працай у вялікія гарады. Некаторыя трымаюць кароў, каб пракарміць сям'ю ды падзарабіць продажам малака. У мясцовасцях непадалёк турыстычных цэнтраў і манастыроў людзі наймаюць кватэры. Цяжка жыць на вёсках — там калгас найчасцей адзіным месцам працы. Калгасы апынуліся ў складаных эканамічных умовах, няшмат у іх грошай на зарплаты, а прыватным уласнікам зямлі таксама няпроста разгарнуць самастойную сельскагаспадарчую дзейнасць.

Вярнуўшыся з пасёлка ў вялікую Маскву, трэба было зноў прывыкаць да натоўпаў. Побач метро шмат міліцыі. Кантралявалі яны кожнага, хто з выгляду нагадваў азіята. Масквічане баяцца чарговых тэрактаў і са зразуменнем ставяцца да праверак у публічных месцах. У выніку апошніх тэрактаў улады Масквы закрылі да канца ліпеня наведванне Крамля і Чырвонай плошчы. Нават камуністам нельга прабрацца да астанкаў свайго куміра, выстаўленых пасярэдзіне Чырвонай плошчы. Замежным турыстам засталося захапляцца сценамі Крамля ды фатаграфавацца на іх фоне, каб даказаць потым знаёмым, што ўсё-ткі былі ў самім сэрцы Масквы. Мы фатаграфаваліся побач Іверскай часоўні і яе варотаў. Праз гэтыя вароты можна было паглядзець на Чырвоную плошчу, цэнтральны ўваход на Крэмль і рознаколерную царкву Васілія Блажэннага.

(працяг будзе)

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хмарачос паміж блокамі на ўскраіне Масквы

Ракам у Іраку

Наведаў я свайго даўняга суседа з ляўкоўскіх хутароў. Распытаўшы пра даўніну, пачуў я прапанову:

— Скажу я табе вершык.

— Калі ласка.

Гаспадар прадэкламаваў мне верш пра *рэнціста*. Спытаў я яго пра аўтарства твора.

— Гэта верш Фёдара Хлябіча з Рыбакоў.

Перакінуўшыся цёплымі словамі пра аўтара, гаспадар запрапанаваў мне наступны верш; я з ахвотаю згадзіўся...

У Іране, Тэгэране
Сабралося трое драней,
Папілі і паелі,
У выгодзе пасядзелі.
Атлянтыцкую іх карту —
Ці для сьмеху, ці для жартаў —
Зьмятусілі і падзерлі.
А ў Алжыры, а ў Іраку
Абярнуўся Сталін ракам:
Пацалуйце мяне ў с...
І кашулю зь сябе скінуў:
Пацалуйце мяне ў сьпіну!
І давайце, ішакі! —
Сьціснуў Сталін кулакі.
Штурхнуў Рузьвельт Чэрчыля:
Цалуй ты, а пасьля я!..
Як Рузьвельт пацалаваў,
Сталін толькі заіржаў.

Калі я зноў спытаў пра аўтарства верша, мой гаспадар адказаў, што гэты верш быў надрукаваны ў адной з беларускіх газет перыяду нямецкай акупацыі, а яго аўтарам быў чалавек з Тапалян. Ён пасля вайны праседзеў паўгода ў турме, але калі б было вядома, што ён напісаў гэтыя радкі, ён сядзеў бы або намнога больш, або намнога карацей...

* * *

Спярша верш здаўся мне прымітывісцкім і вульгарнаватым, але калі я пачаў разважаць яго, з яго зместу выглянуў нечаканы сэнс. Ад апісваемай падзеі і напісання верша мінула амаль шэсцьдзесят гадоў, але прабіваецца з яго амаль звышчасовая актуальнасць. Бо ж тыя *трое драней* у час другой сусветнай вайны былі праціўнікамі галоўнага ўладара на нашай тэрыторыі, таму яны — драні! Усе... Падразумеваецца, што дабрадзеем быў актуальны тады акупант; беларускаму аўтару найчасцей прыходзілася пакланяцца рознага роду дамінуючым над ім палітыканам і кляйміць сапраўдных або ўяўных яго апанентаў. Сённяшняя трывога за „Ніву" не павінна нікога занадта здзіўляць — мы карыгодна не пакланяемся ніякаму палітычнаму куміру. Сумленнаму чалавеку лягчэй за гэта пралезці сёння праз ігольнае вуха, але хто праўду скажа, той галодны спаць ляжа...

Вернемся яшчэ раз да верша, да яго фінальнага выраду. Не буду разглядаць яго літаральна, бо той заключны вульгарызм з'яўляецца толькі крылатай фразай, якая вельмі метка адлюстравала вынік тэгеранскай сустрэчы. Яе галоўным пераможцам стаў вусаты дыктатар кволай у той час дзяржавы, якога, нягледзячы на прычыненыя ім дзесяткам мільёнаў невіноўных людзей пакуты, згаданыя ў вершы дэмакратычныя лідэры вывелі ў сусветныя палітычныя салоны. А за ім у падобныя ж салоны грымнулі і ягоныя шпікі, якіх у свабодным ад гулагаў свеце палічылі шчырымі гуманітарыямі. І ў атмасферы велізарнага даверу, следам за Рузвельтам і Чэрчылем тэгеранскага перыяду, адчужаныя да гэтай пары разведчыкі вусатага дыктатара таксама былі дапушчаны захопленымі фасадным сацыялізмам інтэлектуаламі ў зону найважнейшых тэхналагічных сакрэтаў. Савецкая агіяграфія ўсхваляе Ігара Курчатава як стваральніка савецкай атамнай бомбы. Але ў сапраўднасці яе бацькамі былі амерыканскія фізікі і іх савецкія новыя знаёмыя; паводле некаторых меркаванняў украдзеная ў даверлівых амерыканскіх вучоных дакументацыя дала 70% агульнага ўкладу ў яе будову; роля Курчатава тут толькі агіяграфічная... 18 гадоў пасля тэгеранскай канферэнцыі былыя саюзнікі сунулі амерыканцам ядзерныя ракеты пад сам нос — на Кубу...

У сённяшні час, калі амерыканцы нахлынулі на Ірак, шмат хто ў нас стаў падсмейваць, што некалькі гадоў раней тыя ж амерыканцы былі альянтамі Ірака супраць Ірана. Але ці амерыканцам і англічанам нельга вучыцца на дапушчанай Рузвельтам і Чэрчылем лёгкадумнасці? Здагадаймася, чаму яны не прапускаюць у палітычныя салоны найбольшага „нашага" вусатага палітычнага героя. І чаму яны рашуча расправіліся з іншым вусатым галаваром — ранейшым, як згадвалася, саюзнікам; наяўнасць у яго зброі „АВС", якую сёння ўсе без аглядкі кінуліся шукаць, была адно віртуальнай зачэпкай, а не рэальнай прычынай расправы. Рэальнай прычынай была абстаноўка ўжо ў Нью-Йорку, а не на ўсё-ткі „чужой" Кубе.

Я ўжо ўяўляю, колькі нашых шчырых чытачоў адчувае сябе быццам у пекле, чытаючы гэты тэкст. Бо ж мы прывучаны не толькі пісаць пад чужую лінейку, але і пад чужую лінейку думаць:

Сталін толькі заіржаў...

Аляксандр Вярбіцкі

Фільмавы вечар

На першы вераснёвы тыдзень прапаную чатыры вартыя ўвагі фільмы.

На пачатак „Анёлы Чарлі: Поўным дапераду" (*Charlie's Angels: Full Throttle*), рэжысёрам якога з'яўляецца Джозеф МакДжы. Тры прыгожыя і інтэлігентныя жанчыны: Дылан, Алекс і Наталі, выпускніцы паліцэйскай акадэміі, працуюць для таямнічага дэтэктыва Чарлі. Перад дзяўчатамі нялёгкая задача — ім трэба знайсці ўкрадзеныя срэбныя бранзалеты. Гэта не звычайныя ўпрыгожанні, толькі спецыяльныя носьбіты інфармацыі, на якіх мікратэкстам выгравіраваны прозвішчы і адрасы ўсіх удзельнікаў федэральнай праграмы аховы сведкаў. След вядзе да Медысан, былой сяброўкі дзяўчат. Але ці ўсё можна так проста растлумачыць? Той абакраў, гэты забіў, а іншы мае ад гэтага карысць... У гэтым фільме так напэўна не будзе!

На экране пабачым такія акцёркі як Кемеран Дыяз, Дру Барымор, Дэмі Мур і Люсі Ліу, а гэта абазначае, што варта выбрацца ў кіно!

„Асновы" (*Basic*) аўтарства Джэймса Мак Тырнана з Джонам Траволтам, Самуэлем Л. Джэксанам і Конні Нільсен у галоўных ролях спадабаецца аматарам ваенных трылераў.

Том Гардзі, былы дэсантнік, агент па справах наркотыкаў, разам з прыгожай капітаніхай вайсковай жандармерыі мае за заданне даведацца, што здарылася ў час трэніровачнага выезду курсантаў са спецатрада ў панамскія джунглі, з якіх вярнулася толькі двое салдат. Расказы вайсковых аб здарэннях у джунглях розняцца між сабою, а паказанні мяняюцца вельмі часта. А што сапраўды здарылася ў джунглях, ведае толькі... Хто? Даведайцеся самі, бо і варта!

„Пра Адама" (*About Adam*) Жэрара Стэмбрыджа гэта прапанова для аматараў рамантычных камедыяў. Галоўны герой — малады і прыгожы, як гэта ў фільмах бывае, Адам — таямнічы мужчына. Вядома пра яго толькі тое, што ён па паходжанні ірландзец і ездзіць на блакітным „Ягуары".

Адам не зусім „звычайны" герой рамантычнай камедыі. Як сам гаворыць на пачатку фільма, робіць ён усё тое, чаго ад яго патрабуюць іншыя: абяцае ажаніцца з Сузі, паэзію чытае з яе сястрой, цешчы расказвае аб цяжкім перыядзе дзяцінства, а са шваграм размаўляе аб аўтамабілях. І ўсе задаволены, ну, можа, не ўсе... Сузі мяняецца, пачынае спаглядаць на жыццё свабадней, цешча рашаецца нешта змяніць у сваім жыцці, так як і іншыя героі. Але куды падзелася шчасце, каханне, сяброўства?! Не адышло на другі план, але лепш пабачце самі, што здарылася з прыгажуном Адамам!

„Шанхайскія рыцары" (*Shanghai Knights*) Дэвіда Добкіна з Джэкі Чанам у галоўнай ролі гэта працяг прыгодніцкай камедыі „Шанхайскі поўдзень". Гэты апошні быў лёгкай пародыяй Дзікага Захаду, а навейшая прадукцыя — таксама, толькі віктарыянскай Англіі.

Пад канец XIX стагоддзя група кітайскіх злачынцаў, якіх ачольвае небяспечны англічанін, крадзе пячаць кітайскага кесара, забіваючы пры гэтым вартаўніка. На вестку аб смерці бацькі галоўны герой выязджае з малога гарадка ў Невадзе і па дарозе забірае з Нью-Йорка свайго сябра Роя (не абышлося тут без серыі змаганняў). І так сябры шукаюць помсты, але не крывавай (ад якой валасы становяцца дыбам), але такой фільмавай, спецыфічнай для Джэкі Чана, якая (страх сказаць!) захапляе эфектамі і гумарам.

Паўліна ШАФРАН

Кладкай „Рэбры зубра" ў паказны запаведнік зуброў

Прыродазнаўчая сцежка „Рэбры зубра" 3,5-кіламетравай даўжыні. Пабудавалі яе паводле праекта ляснічага Яцка Высмулкі ў 1978-1980 гадах. Пачынаецца яна з шашы з Белавежы ў Пагарэльцы (каля 200 метраў за скансэнам).

Перад уваходам на кладку знаходзіцца дошка з картай і кароткімі інфармацыямі. Сцежка пралягае па драўляных кладках і грэблях цераз дрыгвяністыя лясы. Уздоўж сцежкі растуць дрэвы — помнікі прыроды. Ва ўрочышчы „Княгінёўка" знаходзіцца стрэшка. Сцежка давядзе нас у паказны запаведнік зуброў, які заснавалі ў 1936 годзе.

Тут на 28-гектарнай плошчы знаходзіцца 15 загародаў, між іншым, для зуброў, аленяў, сарнаў, лосяў, дзікоў, ваўкоў, зуброняў і конікаў-тарпанаў.

Запаведнік зуброў можна наведваць кожны дзень ад 9 да 17 гадзіны. Глядзець запаведнік можна з праваднікам, можна і без яго, але найперш трэба купіць білет у касе ля ўваходу ў запаведнік. (яц)

Як у горадзе

Вёска Чаромха знаходзіцца пры краёвай дарозе, якая вядзе ў Беларусь праз пагранічны пераход Полаўцы — Пяшчатка. Раней быў тут адзіны пункт дэталёвага продажу ў вёсцы — гэсаўская крама. Зараз маем некалькі такіх пунктаў. Апрача прадпрымальніка Вішанкі, працуе кругласутачна мясная крама птушынай фірмы з Сувалкаў, г.зв. „Курчак". Некалькі месяцаў таму была адкрыта крама „Мах" і апошнім часам кіёск продажу фруктаў і гародніны. Не ўспамінаю аб краме Лявона Селяха, якая займаецца продажам фарбаў і будаўнічай сталяркі. У „гандлёвым" цэнтры (пры дарозе на пагранічны пераход) працуе кантора абмену валюты, а непадалёк яго бензастанцыя, якой уласнікам з'яўляецца Варшаўская фірма „Эльваб". Тут можна купіць не толькі бензін, нафту ці газ, але і будаўнічыя матэрыялы. „Цэпэён", як называюць гэтую краму чарамшане, карыстаецца ўласным транспартам і пастаўляе тавар на месца па жаданні кліента. Стаўка 1,5 зл/км. Паслугамі гэтай фірмы я неаднойчы карыстаўся. Прадаўцы тут ветлівыя — параяць, які тавар найтаннейшы і ці спатрэбіцца ён для данай будоўлі. Гэта важнае для пакупніка. Паколькі Чаромха-Вёска мяжуе са станцыяй, дык можна сказаць, што абедзве мясціны гэта адно пасяленне, хаця дагэтуль гарадскіх правоў Чаромха не атрымала. Можа з уваходам у Еўрасаюз нешта зменіцца?

Уладзімір СІДАРУК

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Да коней трэба мець падыход

Тарпана, каня па прыродзе дзікага — аказваецца — можна аб'ездзіць. Іх прывучэнне для верхавой язды можна пабачыць у „Купале" — аграмурыстычнай гаспадарцы Ірыны і Зіновія Галёнкаў у Арэшкаве. Конікамі і іншымі жывёламі займаюцца там маладыя гарадскія дзяўчаты.

— Езджу вярхом у Варшаве, у „Пастыры" на Волі, ужо з восем гадоў, — кажа Кася Дабравольская, ліцэістка з Урсынава. — Тата ўпершыню пасадзіў мяне на каня, калі мне было тры годзікі. У Гайнаўку прыехала я да сваёй бабулі і тут пазнаёмілася з сяброўкамі, таксама коннічкамі.

Магдалена Мішчук, вучаніца прафесійнай школы ў Гайнаўцы, таксама ездзіць на кані ад васьмі гадоў. Азаў верхавой язды вучылася ў „Сапліцы" каля Варшавы, пасля практыкавалася ў іншых манежах, гайнаўскіх.

— Як выглядаюць заняткі на „Купале"? — пытаю. — Якія карысці ад працы з коньмі і ці яна бяспечная?

— Апекуемся жывёламі: бацькі прывозяць нас у восем гадзін раніцы, пачынаем з накорму жывёл. Пасля „раз'язджаем" коней — каб не застойваліся. Праводзім наведвальнікаў і даглядаем парадку на панадворку. Каля жывёл шмат працы, але гэта вельмі прыемная работа, бо яны заўсёды засцігаюць нас нечым новым. Яны нам удзячны, калі мы штоpанак прыходзім іх карміць, пазнаюць нас.

Коней не баімся, бо яны намі аб'ездженыя. У ліпені мы аб'ездзілі дзве кабылкі: „Ядынку" і „Цыганку". Кабылы тарпанаў спакойныя, не баяцца людзей. Раз'язджаем па наваколлі, па лясах, лугах; ездзім галопам. Апрача таго ездзім па манежы дзеля адшліфоўкі тэхнікі.

Манежнічанне не стварае пагроз, калі ёсць падыход да жывёл, калі няма страху. Вядома, трэба ўсё рабіць асцярожна, але рашуча — коні адчуваюць, калі хто іх баіцца. Трэба гаварыць да каня, ладзіць з ім сувязь. Ну і трэба мець устойлівую, але далікатную, руку, — падкрэслівае Кася Дабравольская.

Міхал Мінцэвіч

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Бензастанцыя фірмы „Эльваб"

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.english-zone.com/

Чуць як не Беласточчына, зямелька родная...

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Маладое сужонства начуе ў гатэлі, у якім ліфт абслугоўвае маладая прыгожая бландзінка. У час язды ліфтам усміхаецца яна да маладажона:

— Здароў, каханы.

Мужчына апускае вочы. Пасля выхаду з ліфта жонка дапытваецца:

— Хто гэта быў?

— Дай мне дыхнуць! Я ўжо ўчора мусіў тлумачыцца, кім з'яўляешся ты!

* * *

Прыходзіць Янка ў заалагічную краму і наракае прадаўцу:

— У мяне клопат: мая папугайка вельмі распусная...

— Дапамагу вам, — адказвае ўласнік крамы. — У мяне два папугаі, якія цэлымі днямі моляцца перакладаючы пацеркі ружанца. Прынясіце сваю птушку, мо гэтыя два неяк на яе паўплываюць.

Праз гадзіну Янка прыносіць сваю папугайку. Убачыўшы кампанію адзін з папугаяў гаворыць другому:

— Кідай гэты ружанец! У нас нарэшце тое, за што маліліся!

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31	32	33	34	35	36	37	38	39
40	41	42	43	44	45	46	47	48	49	50	51	52

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клетці роспісу, складуць загадку, а рашэннем адгаданкі будзе менавіта разгадка гэтай загадкі.

1. напр. Атлантычны = 36 __ 47 __ 30 __ 9 __ 33 __;
2. засцерагае будынак ад дажджу і снегу = 23 __ 18 __ 31 __;
3. крывяносная або залатаносная = 50 __ 44 __ 10 __ 11 __;
4. кавалак цвёрдай пароды для, напрыклад, брукавання вуліц = 20 __ 2 __ 1 __ 32 __ 15 __ 6 __;
5. грыжа = 7 __ 8 __ 3 __ 46 __;
6. Ян, арыянскі магнат, м.інш. кашталян віленскі і ваявода брэсцкі (пам. 1592 г.) або... трубка за страўнікам = 13 __ 14 __ 45 __ 35 __ 21 __;
7. травяністая расліна з галінамі ад зямлі = 27 __ 39 __ 37 __ 38 __;
8. палатняная тара для перавозкі сыпучых цел, або частка акардэона = 43 __ 52 __ 22 __;
9. матэрыял для пісьма = 19 __ 51 __ 26 __ 42 __ 24 __ 25 __;
10. пузырыстая маса на паверхні піва або мора = 12 __ 4 __ 5 __ 41 __;
11. зубчатая пласціна або дыск для разрэзання матэрыялаў = 40 __ 28 __ 17 __ 16 __;
12. чыгуначная або трамвайная лінія = 48 __ 49 __ 29 __ 34 __;

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 29 нумара

Бык, дзея, дым, зуб, кума, Лем, лея, малебен, уезд.

Рашэнне: **Млын меле — мука будзе, язык меле — бяда будзе.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Не плюй у вадзіцу

Сямён — дзябёлы дзяцюк, ростам лічы што метры два з лішнім будзе. Зірнеш іншы раз на гэткага ды думаеш — каб у поўсці быў, дык сапраўдны мядзведзь. І рух, і мова ў яго павольныя — сёння пачне размаўляць, дык назаўтра можа закончыць.

Сусед Сямёнаў і найлепшы сябра Грыша — поўная процілегласць першаму. Маленькага росту (амаль напалову меншы за Сямёна), а рухавасці разоў мо ў дзесяць больш. Быццам тая механічная дзіцячая забаўка, вось ён, праз момант ужо там; размова кулямётная, а ідэй іншы раз за гадзіну больш выдасць, чым брыгада шахцёраў вуглю за рабочую змену. І тым не менш гэтыя дзве процілегласці сябравалі, як і іхнія жонкі.

У адзін з летніх вечароў, калі дзень ужо ўладкоўваўся на адпачынак, а па вясковай вуліцы павольна, быццам хмары адна за другою, крочылі да гаспадынь кароўкі, у хату да Сямёна, як той мячык, укаціўся Грышка.

— Сёма! Падымайся! Ідзем рыбу лавіць! І цішэй — я тут такое прыдбаў! Закачаешся! Ну, дамо!

Пакуль сябар прыўзняўся з крэсла, Грыша, размаўляючы, накруціў вакол Сямёна кругоў з пяць, падаў таму шапку і паспеў зхрумкаць малады агурочак, што ляжаў на стале.

На вуліцы сцямнела і сціхла, толькі ў траве закаханы конік нешта траскацеў сваёй сяброўцы. Грыша прыўзняў галаву да сябра і прашаптаў: „Сямён! Дынаміт у мяне!" І прыўзняў торбачку, што трымаў у руках.

Трэба сказаць, што піратэхнікамі сябры былі аніякімі. Але ж на маленькай вясковай сажалцы, пра якую мясцовыя жанчыны гаварылі, што ў ёй вядро вады ды сто пудоў гразі, грымнула гэтак, што затрэслася зямля, а па тварах сябрукоў сцебанула нечым вільготным. Ды так сцебанула, што пляснуліся адзін ды другі дагары ў нейкую лужыну, адчуўшы, што зверху іх накрыла такая ж смярдзючая лужына, але памерамі і вагою значна большая...

Калі ўсё сціхла, папаўзлі небаракі ў цемры ночы праз узнятую выбухам гразь да вады, каб прамыць залепленыя граззю вочы. Ды вось вады ў сажалцы ўжо не было...

— Сямён! Адплёўваючыся намагаўся дакрычацца да сябра Грыша, але не мог — перашкаджала гразь у роце. Сямён жа ў сваю чаргу не чуў Грышу, бо гразь надзейна заляпіла ягоныя вушы.

* * *

Калі вёску ўскалыхнуў выбух і спалоханыя жонкі сябрукоў заўважылі адсутнасць мужчын, прыўзняўшы спадніцы хуценька пашыбавалі адна насустрач другой, а сустрэўшыся з трывогаю паглядалі ў чорную ноч. Потым, калі адчыніліся дзверы Сямёнавай хаты і на парозе ўзніклі дзве мокрыя фігуры, з бруднай вопраткі якіх сцякала і камякамі ляпала на чысцюткую падлогу гразь, пачалі лаянку на небарак.

Калі ж Грыша, дапамагаючы сябру, пачаў выкалупваць з Сямёнавых вушэй коркі гразі зазвінеў званочкамі ў вясковай ночы жаночы смех.

А ці была ж рыба?

— Ды ніхто ніводнай не знайшоў. Вось толькі крумкання жабаў вёска амаль два гады не чула. Нават бусел засумаваў.

Пятро Акулік

Рызыкоўны заклад

У сувязі са спазненнем даніны мядзведзю Сандару Жоржавічу ў гэтым тыдні не адбыўся сход уселяснога кіраўніцтва. Яго членаў выслалі ў глыб лесу дзеля пошуку прычын спазнення, а таксама з загадам актывізаваць лясны люд.

Гэтым часам на ўскраіне найбольш заходняга ўзлеска змяя Ссапія, вуж Ззянон ды дзік Свіналыч раздумвалі над будучыняй панавання Жоржавіча. Свіналыч, які яшчэ нядаўна быў у кіраўнічым эшалоне, прыгадаў песню, якую ўсё часцей чулася па ўзлесках:

— Стары мядзведзь моцна спіць, моцна спіць. Каб не збудзіць ліха, ходзім усе ціха, як прачнецца, дык нас з'есць!

— Ну так, лясная брацыя баіцца. Невясёла бачу мядзведжую будучыню. Прадчуваю, нічога ад яго не застанецца, — меркаваў вуж Ззянон.

— А я іду ў заклад, што ўсё зробіць і надалей будзе нам панаваць, — не пагадзіўся Свіналыч.

— Не ведаю, не ведаю, — вілася Ссапія.

— Іду ў заклад, што будзе панаваць, пакуль не здохне, нават калі б у нашым лесе высеклі ўсе дрэвы і высахлі ўсе кусты, — дзік не паддаваўся.

— Ну, добра! — Ззянон рашыў біцца аб заклад. — Закладваемся. Толькі на што?

— Я даю свой увесь запас каштанаў, — паабяцаў Сіналыч.

— А я... — на хвіліну задумаўся Ззянон. — А я... іду на ўсё. Даю логава.

Змяя Ссапія аж засіпела ад страху.

— Ну і рызыкант! Закласці сваё логава! Гэта быццам аддаць двухногім сваю скурку, — падумала, але ўзбуджаная стаўкай дадала: — Ну, дык хай будзе.

Калі Свіналыч патупаў у сваю бярлогу, змяя нясмела спыталася ў свайго старога друга Ззянона:

— І не баішся ты страты свайго логава? У цябе ж больш нічога няма?!

Вуж таямніча заўсміхаўся:

— Ты памыляешся, не такі я дурань. А ці я сказаў, чыё гэта логава?

— Не...

— Я пад заклад паставіў логава майго дзядзькі вужацкі.

— Ды ж ён пра гэта нічога не ведае?!

— Не ведае. А калі даведаецца, то, каб не страціць свайго начлежнага месца, трэба будзе яму зрабіць усё, каб я не прайграў заклад.

— А што?

— Можа, ачоліць менш задаволеную лясную брацыю, якая не любіць даваць даніну мядзведзю. Можа, наладзіць за нас тое, над чым мы, Ссапійка, думаем столькі часу.

— Ды гэта не ў парадку ў адносінах да Свіналыча, — падказала сумленне Ссапіі.

— Э-э-э там! Калі дзядзька вужацька справу аформіць, а мы пачнем сваё ўладанне, дык Свіналыч будзе пры карыце. От, дастане ў лапы міністэрства... каштанных спраў.

Ссапія засыкала. У гэты раз ад захаплення.

— Ну дый даў!

— Ну дый! — адказаў задаволены Ззянон ды звіўся какетліва ў клубок.

У той час, калі ўселясное кіраўніцтва шукала прычын склаўшайся сітуацыі, Сандар Жоржавіч у сваёй бярлозе вывучаў табліцу лясных загадаў і забарон. Здалёк чулася, што вышкрэбвае там штосьці нервова, выдзірае кіпцюром.

МакХолад

ISSN 0546-1960